КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №14 (142)
◂ 17 КРАСАВІКА ◂ 2009 г.

# Новы Час



**УЛАДЗІМІР ДУНАЕЎ: «ЕГУ — ГЭТА УНІКАЛЬНЫ ВЫПАДАК У ГІСТОРЫІ ВЫГНАННЯ»**

Стар. 14

**АДКБ І БЕЛАРУСЬ**

Пра ролю і выклікі для Беларусі ў сувязі з удзелам у ваенным саюзе пад эгідай Расіі з экспертам Раманам Якаўлеўскім размаўлялі Аляксей Караль і Вольга Хвоін.

Стар. 4

**РЭГІЯНАЛЬНАЕ РЭХА ЧАРНОБЫЛЬСКАГА ШЛЯХУ**

На ўгодкі Чарнобыльскай трагедыі лідэры палітычных партый з'едуць са сталіцы ў рэгіёны. Акцыі 26 сакавіка пройдуць у Магілёўскай, Гродзенскай і Гомельскай абласцях.

Стар. 5

**СЕПАРАТЫСТЫ, ЯДНАЙЦЕСЯ!**

Стар. 11

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**Адноўленая «Літаратурная Беларусь»**

Навіны. Публіцыстыка. Паэзія. Проза.

▸ З НАГОДЫ

# МАЙСТЭРСТВА ШАБЛОНУ

Вольга ХВОІН

**Дваццаць гадоў таму, у 1989 годзе, у Мінску адбыўся першы Чарнобыльскі шлях. Акцыя мела ярка акрэслены пасыл — пратэст супраць палітыкі ўладаў замоўчвання наступстваў выбуху на Чарнобыльскай АЭС. У першай палове 1990-х гадоў 26 красавіка на вуліцы Мінска выходзілі тысячы людзей. Праз два дзесяцігоддзі Чарнобыльскі шлях — гэта сумесь жалобы, памінання і пратэсту, афармленая ў традыцыйнае шэсце з кароткім мітынгам-набажэнствам. Колькасць удзельнікаў скарацілася ў разы, на акцыю ходзяць прыхільнікі каляапазіцыйных колаў. Для непалітызаваных грамадзян Шлях даўноператварыўся ў «акцыю, якую штогод ладзіць апазіцыя». І не больш за тое.**



За дваццаць год вырасла новае пакаленне беларусаў, для якіх Чарнобыльская трагедыя з катэгорыі Вялікай Айчыннай — ну, было, але не са мною, даўно, і ўвогуле ўжо не актуальна. Палітызаванасць, закасцянеласць формы правядзення Шляху і старанная шматгадовая дзяржаўная прапаганда на тэму адраджэння забруджаных тэрыторый зрабілі сваю справу — з акцыі насамрэч масавай і рэзананснай Чарнобыльскі шлях ператварыўся ў нічым не адметнае вулічнае шэсце ў шэрагу іншых апазіцыйных.

Каб знайсці дзесяць адрозненняў паміж традыцыйнымі Дзядамі, Днём Волі і Чарнобыльскім шляхам трэба добра напружыцца. Адны і тыя ж прамовы, выступоўцы, маршрут — у бок Бангалору. Гэтаму можна знайсці прычыны, калі пакапацца ў выніках сацыялагічных даследаванняў — пратэстныя настроі апошніх гадоў мінімальныя, дабрабыт грамадзян паціху рос, а памяць сцірала жахлівыя вобразы трагедыі.

Але актуальнасць праблемы з гадамі не паменшылася — хіба анкалагічны цэнтр у Бараўлянах пустуе, хіба адселеныя вёскі пад ціскам прымусовага размеркавання маладых спецыялістаў завіравалі жыццём? Улада сцвярджае, што праблема амаль вырашана, і, магчыма, не так далёка той дзень, калі ў краіне паўстане свая АЭС. І тут узнікае пытанне: калі апазіцыя, якая штогод ладзіць Чарнобыльскі шлях, лічыць гэтую тэму злабадзённай, то дзе акцыі шырокага інфармавання насельніцтва, дзе эфектыўныя механізмы працы з грамадскай думкай? І не трэба спасылацца на абмежаваны доступ да СМІ і рэпрэсіі. З зайздросным пастаянствам палітыкі заяўляюць, што «ідуць у народ», толькі вынікаў гэтых паходаў не бачна.

Неяк на форуме аднаго СМІ чытачка абуралася фотаздымкамі хворых дзетак з анкалагічнага цэнтру, маўляў неэтычна выносіць на публіку гора, гэта тэма толькі для «сваіх». Нашы палітыкі часам нагадваюць мне тую чытачку: абмеркавалі ў соты раз у вузкіх колах і разышліся сабой задаволеныя, а праблема засталася. І новыя людзі пра яе не даведаліся. Цяжка дайсці да рэгіёнаў, яшчэ цяжэй арганізаваць там людзей.

Але ў сталіцы праблема камунікацыі куды меншая: інтэрнэтам карыстаецца пераважная большасць сацыяльна актыўных грамадзян. Што ім сёлета прапанавалі бонзы палітыкі? Традыцыйна прызначылі час і месца, паабяцаўшы «сюрпрызы». Але ніхто даўно не чакае ад апазіцыі «сюрпрызаў», а інфармацыйная падрыхтоўка да акцыі ў выглядзе парачкі прэс-канферэнцый нават не выклікае жадання рабіць нейкія ацэнкі. У выніку ўсё адбудзецца па старому сцэнару, пасля чаго арганізатары адрапартуюць пра «паспяхова» праведзеную акцыю. А праз паўгады-год дадуць некалькі прэс-канферэнцый з гэтай нагоды і зладзяць яшчэ адзін клон Чарнобыльскага шляху ці Дня Волі. Назва не мае значэння, бо змест будзе адзін і той жа.

Народу патрэбны хлеб і відовішчы — старая і збітая ісціна. Хлеб надзённы апошнія гады беларусы мелі, відовішчы ж ім забяспечвала дзяржава ў выглядзе размаітых народных гулянак. Далёка не інтэлектуальных і без глыбокага філасофскага падтэксту, затое весела і з размахам. Кіраўніцтва ж апазіцыйных партый наіўна думае, што людзі ходзяць паслухаць іх стандартныя прамовы, а займальна і цікава — гэта не ў іх кампетэнцыі. Нават калі б так і было, то нямногія пачулі б, бо манера выступаць з кепскай гукаўзмацняльнай апаратурай ужо стала завядзёнкай. Насамрэч людзі даўно ідуць не на акцыю, а «патусавацца» са знаёмымі. Хто неабыякавы да пачуцця калектывізму — прыходзіць, каб адчуць сябе не адзінокім у сваіх поглядах-прыхільнасцях. Толькі выніку з гэтых «тусовак» і адчуванняў не шмат.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### БРЭСТ. АКЦЫЯ «ЕЎРАПЕЙСКАЙ БЕЛАРУСІ»

**У Брэсце мясцовыя актывісты грамадзянскай кампаніі «Еўрапейская Беларусь» правялі 12 красавіка акцыю, прысвечаную «Чарнобыльскаму шляху» і будаўніцтву ў Беларусі АЭС.**

Як паведаміў прадстаўнік кампаніі Яўген Скрабец, трое актывістаў у белых халатах і процівагазах выйшлі да кінатэатра «Беларусь» на вуліцы Савецкая. З 15.00 да 15.20 яны распаўсюджвалі сярод жыхароў горада ўлёткі з інфармацыяй пра «Чарнобыльскі шлях–2009», што намечаны на 26 красавіка ў Мінску, а таксама пра праблемы, якія можа прынесці будаўніцтва АЭС. Мэта акцыі — прыцягнуць увагу жыхароў абласнога цэнтра да гэтых дзвюх падзей. Усяго было раздадзена каля 150 улётак. Ніхто з удзельнікаў акцыі затрыманы не быў.

### МАГІЛЁЎ. ЯШЧЭ АДНА ПАРТЫЯ

**Устаноўчы з'езд Партыі свабоды і прагрэсу (ПСП) адбудзецца 18 красавіка ў Магілёве. Пра гэта паведаміў лідэр аргкамітэта па стварэнні партыі Уладзімір Навасяд.**

Планавалася, што ўстаноўчы з'езд пройдзе ў Мінску, аднак аргкамітэту не ўдалося атрымаць дазвол на выдзяленне неабходнага памяшкання. «Мы падавалі заяўкі прыкладна ў 30 арганізацый Мінска і іншых гарадоў Беларусі, аднак ніводная з іх задаволена не была. Давялося выкарыстаць запасны варыянт з памяшканнем, хаця хацелі правесці з'езд у спецыяльна выдзеленым месцы», — паведаміў У. Навасяд.

Пасля з'езда прадстаўнікі аргкамітэта ў чацвёрты раз паспрабуюць зарэгістраваць партыю ў Міністэрстве юстыцыі.

### ГОМЕЛЬ. ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ ПРОСЯЦЬ ЗНІЗІЦЬ ПАДАТКІ

13 красавіка індывідуальныя прадпрымальнікі, якія гандлююць на рынках Гомеля, перадалі ў абласны савет дэпутатаў адозву з патрабаваннем знізіць стаўкі адзінага падатку на 40–50%. Пад адозвай падпісаліся каля 2,5 тысячы чалавек.

Стаўкі адзінага падатку для ІП былі павялічаны з 1 красавіка. Напрыклад, у Гомелі для гандляроў абуткам яны ўзраслі ў тры разы.

Ініцыятарам адозвы да гомельскіх уладаў выступіў старшыня савета РГА «Перспектыва» Анатоль Шумчанка, які 3 красавіка абмяркоўваў гэтую праблему з гомельскімі чыноўнікамі. Сёння ён прыехаў у Гомель для чарговых перамоў з уладамі і перадачы ім адозвы. Да гэтага часу каля будынка аблвыканкама сабралася каля 100 індывідуальных прадпрымальнікаў.

Лідэр «Перспектывы» сустрэўся са старшынёй абласвета дэпутатаў Валерыем Сяліцкім, кіраўніком камітэта эканомікі аблвыканкама Эльвірай Карніцкай і начальнікам абласной інспекцыі па падатках і зборах Галінай Пашэд. Пасля перамоў ён паведаміў, што прынята рашэнне ўключыць ІП у склад рабочай групы, якая зоймецца аналізам сітуацыі са стаўкамі адзінага падатку. Бліжэйшымі днямі аблвыканкам абяцаў накіраваць адпаведныя лісты ў саветы гомельскіх рынкаў.

«Дэпутаты без сесіі нічога зрабіць не могуць, задача прадпрымальнікаў — паскорыць працэс склікання сесіі. Таму трэба, каб актывісты на рынках уключыліся ў рабочую групу, каб у яе ўвайшлі людзі, якія будуць адстойваць вашы інтарэсы», — падкрэсліў Шумчанка. Ён лічыць, што пакуль «улада дзейнічае абсалютна адэкватна ў гэтай сітуацыі». «Нас не выкінулі, не выгналі, выслухалі, ствараюць рабочую групу, значыць — гатовыя да дыялогу», — сказаў Шумчанка.

Разам з тым, паводле яго слоў, «уладам таксама патрэбны нейкія абгрунтаванні для выхаду з гэтай вельмі напружанай сітуацыі».

**Паводле БелаПАН**

---

▸ МОЛАДЗЬ

## «МАРШ ЗА НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ»

**Генадзь КЕСНЕР**

**14 мая ў Мінску павінен адбыцца «Марш за незалежнасць». Пра гэта на прэс-канферэнцыі на пачатку тыдня паведамілі лідэры зарэгістраванага ў Чэхіі Міжнароднага моладзевага аб'яднання «Малады Фронт».**

Акцыя мае адбыцца 14 мая — у чатырнаццатую гадавіну рэферэндуму 1995 года, калі беларуская мова была пазбаўлена статуса адзінай дзяржаўнай мовы Рэспублікі Беларусь, а нацыянальны бел-чырвона-белы сцяг і герб «Пагоня» ўвогуле апынуліся па-за законам.

«За час свайго кіравання Беларуссю Аляксандр Лукашэнка неаднаразова ставіў пад пагрозу суверэнітэт і незалежнасць краіны, — заявіў лідэр маладафронтаўцаў Зміцер Дашкевіч. — А ў сувязі з апошнімі падзеямі, а менавіта з эканамічным крызісам, які найбольш закрануў нерэфармаваную эканоміку Беларусі, кіраўнік дзяржавы яшчэ больш узмацніў дзейнні па гандлі суверэнітэтам Беларусі, каб здабыць эканамічныя прэферэнцыі як з Усходу, так і з Захаду».

Лідэры «Маладога Фронту» заклікаюць далучыцца да акцыі на абарону незалежнасці краіны ўсе дэмакратычныя сілы Беларусі. Па словах актывіста арганізацыі Паўла Кур'яновіча, заяўка на правядзенне мерапрыемства 14 мая ў Мінгарвыканкам падавацца не будзе. «Загадзя вядомы вынік разгляду заяўкі, таму не варта марнаваць часу», — лічыць маладзевы актывіст.

Па інфармацыі маладафронтаўцаў, збор удзельнікаў акцыі адбудзецца ў 18.00 на Кастрычніцкай плошчы, адкуль удзельнікі мерапрыемства мірным шэсцем па ходніках плануюць прайсці да Плошчы Незалежнасці, дзе акцыя і мусіць скончыцца. Зміцер Дашкевіч выказаў спадзяванне, што ўлады не пойдуць на правакацыі і дадуць мірна правесці «Марш за незалежнасць».

Самі арганізатары не маюць ілюзіяў наконт вялікай колькасці ўдзельнікаў і разлічваюць на некалькі соцень, сама больш, на тысячу прысутных, «якім неабыякавы лёс Бацькаўшчыны».

---

▸ РЭГІСТРАЦЫЯ

## ЛІБЕРАЛІЗАЦЫЯ НЕ ДЛЯ НДА

**Марыя КРУК**

**Нягледзячы на фасадную лібералізацыю, пераменаў у дзяржаўнай пазіцыі ў дачыненні да трэцяга сектару не назіраецца. Зарэгістраваць НДА па-ранейшаму амаль немагчыма.**

Міністэрства юстыцыі адмовіла ў рэгістрацыі партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя». Падставай сталі выяўленыя мінюстам парушэнні заснавальнікамі парадку стварэння партыі падчас правядзення яе ўстаноўчага з'езда і ўстаноўчых рэгіянальных сходаў. Аднак сустаршыня аркамітэта па стварэнню БХД Павел Севярынец лічыць, што метады праверкі дадзеных не адпавядалі заканадаўству. Бліжэйшым часам кіраўніцтва БХД паведаміць, ці будзе паўторна падаваць дакументы на рэгістрацыю, рашэнне Мінюста абскардзяць у Вярхоўным судзе.

На днях аргкамітэт па стварэнню Асамблеі няўрадавых дэмакратычных аб'яднанняў атрымаў з Мінюста ліст за подпісам намесніка міністра Аляксандра Сіманава з адмоваю ў рэгістрацыі. Падставай сталі быццам бы дапушчаныя парушэнні пры заснаванні. У прыватнасці, сцвярджаецца, што ўстаноўчая дамова з'яўляецца несапраўднай, паколькі кіраўнікі арганізацый-заснавальнікаў Асамблеі НДА падпісалі яе без згоды кіруючых органаў гэтых грамадскіх аб'яднанняў. Таксама адзначаецца, што назва арганізацыі не адпавядае патрабаванням заканадаўства, бо не ўтрымлівае ўказання на прадмет дзейнасці. Ініцыятары стварэння асамблеі прэтэнзіі лічаць неабгрунтаванымі і будуць абскарджваць рашэнне Мінюста ў судзе.

Рэгістрацыя руху «За свабоду» пад кіраўніцтвам Мілінкевіча надала імпэту шэрагу НДА, якія хочуць увайсці ў праваное поле краіны і працаваць легальна. Але пыл трэцясектарных актывістаў Мінюст традыцыйна астудзіў. Чарговую адмову ў рэгістрацыі атрымала праваабарончае грамадскае аб'яднанне "Вясна" пад кіраўніцтвам Алеся Бяляцкага, у Магілёве праз бюракратычныя перашкоды не прайшло моладзевае грамадскае аб'яднанне «Модэс», у Гродна — мясцовая філія партыі БНФ (падставаю сталі прэтэнзіі да шрыфту заявы).

«Цяпер рэгіструючыя органы суцішваюць эфект, які зрабіла на грамадзянскую супольнасць рэгістрацыя руху «За свабоду». Была вялікая хваля ініцыятываў, якія падавалі дакументы на рэгістрацыю, многія рыхтуюць цяпер да ўстаноўчых сходаў, — адзначае юрыст Юрый Чавусаў. — Але палітыка ў галіне рэгістрацыі грамадскіх аб'яднанняў не змянілася».

Шматразовыя спробы зарэгістравацца і канвеер адмоваў у кіраўнікоў некаторых арганізацый ужо набілі аскому. Людзі банальна стаміліся змагацца з бюракратычнай машынай і за лепшае лічаць спыніць «вайну з ветракамі». Напрыклад, Алесь Бяляцкі заявіў, што «Вясна» падае дакументы на рэгістрацыю апошні раз.

---

▸ ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## ВАЦЛАЎ ГАВЭЛ — СЯБРА БЕЛАРУСКАГА ПЭН-ЦЭНТРА

**Экс-прэзідэнт Чэхіі, вядомы пісьменнік Вацлаў Гавэл прыняў запрашэнне Беларускага ПЭН-цэнтра стаць ганаровым сябрам арганізацыі.**

Як паведаміў БелаПАН сябар савета Беларускага ПЭН-цэнтра Уладзімір Сіўчыкаў, рашэнне абраць Гавэла ганаровым сябрам ПЭН-цэнтра было прынята «як удзячнасць за ўсё тое, што ён зрабіў для беларускай грамадзянскай супольнасці, адстойвання правоў чалавека, для беларускай літаратуры і журналістыкі».

У лісце Гавэла ў адказ гаворыцца: «Я хацеў бы выказаць падзяку за абранне мяне ганаровым сябрам Беларускага ПЭН-цэнтра. Для мяне гэта вялікі гонар. Я таксама разумею, што гэта будзе спрыяць добрым адносінам паміж беларускай і чэшскай культурамі і іх узаемнаму ўзбагачэнню, а таксама іх сумеснаму ўнёску ў скарбонку еўрапейскай літаратуры».

У найбліжэйшы час, паведаміў Сіўчыкаў, Вацлаву Гавэлу будзе накіравана запрашэнне наведаць Мінск для таго, каб ва ўрачыстай абстаноўцы ўручыць сяброўскі білет. Таксама плануецца ўдзел пісьменніка ў прэзентацыі яго кнігі выступленняў і эсэ.

---

▸ ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

## НЕДАВЫКАЗАНАЕ

**10 красавіка ў Беларускім ПЭН-цэнтры прайшла прэзентацыя кнігі ўспамінаў дысідэнта Барыса Клейна «Недосказанное. Имена».**

Яе аўтар, пазбаўлены на пачатку сямідзесятых дыплома кандыдата гістарычных навук і пасведчання дацэнта Гродзенскага педінстытута, цяпер жыве ў ЗША і на прэзентацыю прыехаць не змог, але даслаў прысутным свой відэавыступ.

У ім Барыс Клейн прыгадвае: «Кнізе сваёй я даў назву «Недосказанное. Имена». Чаму недавыказанае? Таму што савецкая ўлада, пазбаўшы мяне навуковай ступені і звання, забараніла выступаць публічна, друкавацца, мне нельга было шукаць працу па сваёй ахвоце, пераязджаць з Гродна ў іншае месца, вольна сустракацца з людзьмі. Так, і гэта — таксама. Памятаю, як увосень 1971 года да мяне на вуліцы насупраць універмагу падышоў Васіль Быкаў. Змрочным быў ягоны твар. Ён перадаў мне навіны бліжэйшыя такімі словамі: «Ведаеш, Барыс, мяне выклікалі ў КДБ і сказалі, каб я да цябе больш не падыходзіў, інакш яны зладзяць групавую справу, а па ёй і тэрміны будуць большымі».

Прэзентацыя кнігі адбылася з другой спробы. Першы раз 27 сакавіка яе забаранілі праводзіць у музеі Ванькови ча.

---

▸ ЛІБЕРАЛІЗАЦЫЯ

## ЗАТРЫМАЛІ НА МЯЖЫ

**Раніцай 16 красавіка на мяжы з Літвой былі затрыманыя Анатоль Лябедзька, Аляксандр Казулін, Вінцук Вячорка і Артур Фінькевіч.**

Беларускія палітыкі ехалі на сустрэчу з амерыканскімі кангрэсменамі ў Вільню. Але іх машыну затрымалі, двойчы дагледзелі і правялі асабісты дагляд.

Аб 11-й гадзіне Анатолю Лябедзьку, Аляксандру Казуліну і Вінцуку Вячорку ўсё ж дазволілі ехаць у Вільню. А вось лідэру «Маладой Беларусі» Артуру Фінькевічу ў выездзе за мяжу адмовілі.

**svaboda.org**

ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# НІЧОГА АСАБІСТАГА — ТОЛЬКІ БІЗНЕС

Сяргей САЛАЎЁЎ



**Мінулы тыдзень быў вельмі багаты на гучныя заявы, якія далей за заявы не пайшлі. Прычым гэта былі заявы знакавыя. Расія, прыкладам, вуснамі свайго пасла адказала на гучныя выпады Аляксандра Лукашэнкі.**

Яшчэ 9 красавіка беларускі прэзідэнт заявіў, што Беларусь не заслугоўвае «такога стаўлення» з боку Расіі. «Дайшло да таго, што пачалі публічна папракаць, маўляў, далі вам крэдыт у 2 мільярда долараў. Нам МВФ даў крэдыт на лепшых умовах. А колькі Расіяй за апошнія паўтара-два гады было выцягнута з эканомікі Беларусі за кошт незаконнага ўвядзення пошліны на нафту, трохразовага павышэння цаны на газ? Больш за 10 мільярдаў долараў за паўтара гады забралі і 2 мільярда долараў пад дзікі працэнт далі! Што ж, дзякуй, што далі, хаця б так, і то добра», — сказаў А. Лукашэнка.

І вось нарэшце на гэтым тыдні адказ прэзідэнту даў расійскі пасол у Беларусі Аляксандр Сурыкаў. Трэба ўважліва разабрацца, колькі Расія «выцягнула», а колькі «ўнесла» ў эканоміку Беларусі, заявіў ён.

Ён зазначыў, што «ў сувязі з ростам цэн на нафту ў 2006–2008 гадах Расія плаўна павышала цэны на газ: ва ўзгодненым рэжыме, у адпаведнасці з заключанымі кантрактамі на газ і нафту». «Калі ў 2006 годзе сусветная цана на газ была 293 долары, Беларусь плаціла амаль 47 долараў, гэта значыць менш на 247 долараў. У 2008 годзе сусветная цана на газ склала 409 долараў, Беларусь плаціла 128, гэта значыць на 281 долар менш», — нагадаў дыпламат.

Паводле слоў Сурыкава, за перыяд з 2006 па 2008 год Беларусь заплаціла Расіі за энерганосьбіты «прыкладна на 10 мільярдаў долараў больш, чым раней». «Але ў той жа час, — падкрэсліў Сурыкаў, — скрытыя прэферэнцыі на розніцы ў цэнах на энерганосьбіты ў 2006 годзе прынеслі эканоміцы Беларусі 9,4 мільярда долараў, а ў 2008 годзе — 11,5 мільярда».

Кіраўнік расійскай дыпмісіі заявіў, што Беларусь «не будзе плаціць тыя рынкавыя цэны на энерганосьбіты з Расіі, якія будуць устаноўлены для астатніх імпарцёраў, бо адсутнічаюць вывазныя пошліны». А гэта «вельмі сур'ёзная канкурэнтная перавага для беларускай эканомікі». «Таму, калі кажуць, што Расія нешта адабрала або выпампавала, трэба ўважліва разабрацца. У мяне ўражанне, што нават наадварот: мы «ўнеслі» ў Беларусь дадаткова 2,5 мільярда долараў», — лічыць Аляксандр Сурыкаў.

Нарэшце Расія прызналася ў тым, што яна фактычна спансуе эканоміку Беларусі. Пра гэта шмат казалі беларускія палітыкі і незалежныя эканамісты, але раней улада ўсе абвінавачванні абвяргала. Зараз жа — супраць фактаў не папрэш.

Добрую навіну прынесла і сесія Палаты прадстаўнікоў. 15 красавіка дэпутаты прынялі ў двух чытаннях законапраект «Аб амністыі ў сувязі з 65-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў».

У выніку амністыі будзе вызвалена каля 4,5 тысяч чалавек. Мяркуемая эканомія сродкаў рэспубліканскага бюджэту складзе 2 мільярда рублёў. Паводле законапраекта, ад крымінальнай адказнасці будуць вызвалены льготныя катэгорыі асобаў, якія ўчынілі злачынствы, што не ўяўляюць значнай грамадскай небяспекі (да двух гадоў пазбаўлення волі), і менш цяжкія злачынствы (да шасці гадоў пазбаўлення волі). Гэта непаўналетнія; цяжарныя або жанчыны і адзінокія мужчыны, што маюць непаўналетніх дзяцей; пенсіянеры; інваліды; хворыя на актыўную форму туберкулёзу; ВІЧ-інфікаваныя; ветэраны баявых дзеянняў; удзельнікі ліквідацыі наступстваў катастрофы на ЧАЭС; асобы, якія атрымалі раненні пры выкананні абавязкаў у перыяд праходжання службы.

Іншыя катэгорыі асобаў будуць вызваляцца ад пакарання ў выглядзе арышту, абмежавання волі, накіравання ў дысцыплінарную воінскую часць, пазбаўлення волі пры асуджэнні за злачынствы, што не ўяўляюць значнай грамадскай небяспекі, а таксама пры асуджэнні да арышту — незалежна ад тэрміну адбывання пакарання; за менш цяжкія злачынствы — пры адбыванні не менш чым адной чвэрці тэрміну пакарання; за асабліва цяжкія эканамічныя злачынствы: крадзеж, махлярства, прысваенне або растрату, крадзеж шляхам выкарыстання камп'ютэрнай тэхнікі ў буйным і асабліва буйным памеры (за выключэннем асобаў, якія ўчынілі злачынствы ў складзе арганізаванай групы) — пры адбыванні не менш чым адной траціны тэрміну пакарання; за любое злачынства — калі да завяршэння тэрміну адбывання пакарання засталося менш як год.

Пры гэтым асуджаныя, якія не падлягаюць вызваленню ад далейшага адбывання пакарання, будуць вызваляцца ад названых пакаранняў часткова тэрмінам на год.

А тым часам фінансавыя цяжкасці напаткалі саму апазіцыю. Партыя БНФ можа страціць офіс у цэнтры Мінска. ЖРЭА Савецкага раёна сталіцы адмаўляецца працягваць тэрмін арэнды з кіраўніцтвам цэнтральнага офіса партыі.

Як зазначаецца ў лісце, які прыйшоў у офіс Партыі БНФ 13 красавіка, тэрмін арэнды заканчваецца 8 ліпеня 2009 года і працягвацца не будзе. У ЖРЭА сцвярджаюць, што арандатар «сістэматычна парушае ўмовы дамовы: аплата прыходзіць несвоечасова і не ў поўным аб'ёме, у выніку чаго на пачатак красавіка ўтварылася запазычанасць у суме 6 мільёнаў 381 тысяч 396 рублёў». У лісце прапаноўваецца ў тэрмін да 17 красавіка аплаціць запазычанасць, а таксама вызваліць займанае памяшканне пасля заканчэння тэрміну дзеяння дагавора. У адваротным выпадку ЖРЭА мае намер звярнуцца ў гаспадарчы суд з іскам аб высяленні.

Каментуючы сітуацыю, сакратар управы Партыі БНФ Наталля Красуцкая паведаміла, што запазычанасць у памеры 6 мільёнаў рублёў была пагашана 9 красавіка. Аднак сёння, паводле слоў Красуцкай, у банку паведамілі пра яшчэ адну запазычанасць — у памеры 2,7 мільёна рублёў. «Гэта сам банк наблытаў са сваімі плацежнымі ведамасцямі», — сцвярджае сакратар.

Офіс Партыі БНФ — не толькі офіс партыі, але і культурна-інфармацыйны цэнтр, дзе праходзяць розныя мерапрыемствы дэмакратычных партый і арганізацый Беларусі. Шкада будзе, калі яго страцяць...

Таксама ўскладнілася і сітуацыя вакол неафіцыйнага Саюза палякаў на Беларусі. 15 сакавіка гэтага года на VII з'ездзе неафіцыйнага Саюза палякаў была прынята адозва да Аляксандра Лукашэнкі з прапановай наладзіць дыялог паміж арганізацыяй і дзяржструктурамі. Такі дыялог, зазначалася ў дакуменце, мог бы спрыяць дзяржаўнай рэгістрацыі СПБ.

Але 13 красавіка тэкст адозвы вярнуўся да кіраўніцтва аб'яднання з афіцыйным каментарам Адміністрацыі прэзідэнта. У ім гаворыцца, што афіцыйным Саюзам палякаў на Беларусі кіруе Юзэф Лучнік, а ўсе астатнія прысвойваюць сабе права гаварыць ад імя гэтай арганізацыі. Такім чынам, на перамовы ўлады не пайшлі. Вось табе і лібералізацыя!

АСОБЫ ТЫДНЯ

## ІСУС ХРЫСТОС



Бадай, самай значнай фігурай гэтага тыдня не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі з'яўляецца Ісус Хрыстос: на мінулых выхадных яго ўваскрашэнне адзначалі каталікі і пратэстанты ўсяго свету, на гэтых — Вялікдзень у праваслаўных.

І хаця, паводле нядаўняга даследавання цэнтра *Gallup*, толькі 27 працэнтаў нашых суграмадзян прызналі, што рэлігія займае важнае месца ў іх жыцці, агульная колькасць вернікаў у краіне перавышае 50 працэнтаў. Беларусы не такія набожныя як, напрыклад, палякі, і нават трапілі ў лік адзінаццаці з найбольш няверуючых краінаў. «Як трывога — тады да Бога», — кажуць у народзе, што сведчыць пра сціпласць беларусаў і нежаданне надакучваць Усявышняму будзённасцю, хіба толькі ў святы шырыцца плынь вернікаў да касцёлаў і цэркваў. І тут варта нагадаць словы мітрапаліта Кандрусевіча, што на Каляды і Вялікдзень галоўнае не атрыбуты — ялінкі і фарбаваныя яйкі, але найперш духоўная падрыхтоўка.

## КСЁНДЗ ЮРЫЙ БАРОК



Ксёндз Юры Барок з мястэчка Глыбокае Віцебскай вобласці патрапіў пад прэс ідэалагічнай машыны за арганізацыю сустрэчаў з прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі. У прыватнасці мясцовае кіраўніцтва не задаволена тым, што святар арганізаваў сустрэчы жыхароў мястэчка з рэдактарам часопіса «ARCHE» Валерам Булгакавым, кіраўніком газеты «Наша Ніва» Андрэем Дыньком, зладзіў прэзентацыю перакладзенай на беларускую мову дзіцячай кніжкі «Віня-Пых».

«Уся гісторыя распачалася яшчэ ў лістападзе мінулага года. У Дзень памінання продкаў, я маліўся на глыбоцкіх могілках за памерлых, а таксама за ахвяраў фашызму і камунізму, за ўсіх ахвяраў несправядлівасці мінулых часоў, — цытуе прэс-служба аргкамітэта Беларускай хрысціянскай дэмакратыі словы ксяндза. — Праз некалькі дзён мяне выклікаў глыбоцкі ідэолаг Міхаіл Чарапкоўскі. Ён мяне абвінаваціў у скажэнні гісторыі, бо, на ягоную думку, нельга ставіць на адзін узровень ахвяраў фашызму і камунізму. Чыноўнік заявіў, што не варта нават казаць пра загінулых ад камуністычнай ідэалогіі, бо насамрэч нічога такога і не было. Я ў адказ заявіў, што ў мяне ёсць свае меркаванні на гэты конт — і ніхто мне не замінае па-свойму трактаваць гэтыя падзеі. На гэтым мы тады і разышліся». Калі малітвы ксяндзу даравалі, то шчыраванне на культурнай ніве — не. У аблвыканкам выклікалі канцлера, дзе паведамілі, што абласны аддзел ідэалогіі атрымаў паперу з адпаведных структур з Мінску, таму варта прыняць меры ў адносінах да Юрыя Барка і яго дзейнасці. Калі ж ксёндз не перастане ладзіць культурніцкія сустрэчы, дзяржава ўжыве іншыя рычагі ўздзеяння на святара.

## ЗМІЦЕР ДАШКЕВІЧ



Кіраўнік зарэгістраванай у Чэхіі грамадскай арганізацыі «Малады Фронт» Зміцер Дашкевіч на гэтым тыдні вылучыўся публічна агучанай пазіцыяй нонканфармізму. Маладзевы актывіст паведаміў, што 14 мая ў Мінску плануецца правесці «Марш за незалежнасць», прымеркаваны да чарговых угодкаў рэферэндуму 1995 года, калі герб «Пагоня» і бел-чырвона-белы сцяг былі заменены на сучасныя. Заяўку на правядзенне шэсця ад Кастрычніцкай да плошчы Незалежнасці арганізатары падаваць не будуць прынцыпова, бо не вераць, што атрымаюць дазвол.

Улада даўно манапалізавала цэнтр сталіцы для правядзення вулічных акцый, адвёўшы апазіцыі плошчу Бангалор падалей ад адміністрацыйных будынкаў, дзе засядаюць чыноўнікі, і ад шырокай грамадскасці. Звычайна спробы правесці масавыя акцыі на Кастрычніцкай плошчы маюць даволі спантанны характар (найбольш масавыя — мітынг пасля прэзідэнцкіх выбараў 2006 года, мітынг і невялікае шэсце мінулай восенню пасля выбараў у «палатку», акцыі прадпрымальнікаў) і заканчваюцца разгонам ці высяленнем дэманстрантаў з цэнтра горада.

Чым скончыцца незаяўлены Марш за незалежнасць, спрагназаваць цяжка, бо акурат у маі ў Чэхіі мае адбыцца саміт «Усходняга партнёрства» і кіраўніцтва краіны дужа зацікаўлена захаваць «добрую міну пры кепскай гульні».

**Падрыхтавала Вольга Хвоін**

ЭКСПЕРТЫЗА

# АДКБ І БЕЛАРУСЬ

**16–17 красавіка ў Ерэване адбудзецца пасяджэнне Савета міністраў замежных спраў Арганізацыі дамовы аб калектыўнай бяспецы (АДКБ). Як паведамляе афіцыйнае інфармагенцтва БЕЛТА, у парадку дня абмеркаванне пытанняў знешнепалітычнага супрацоўніцтва дзяржаў-сяброў АДКБ па праблемах міжнароднай бяспекі, у тым ліку стану і перспектываў дзейнасці Арганізацыі на афганскім напрамку. Таксама будуць разглядацца асноўныя напрамкі ўзаемадзеяння з міжнароднымі і рэгіянальнымі арганізацыямі, у прыватнасці, з ААН і АБСЕ. Кіраўнікі знешнепалітычных ведамстваў разгледзяць прапановы Савета міністраў абароны і Камітэта сакратароў савета бяспекі АДКБ, накіраваныя на актывізацыю ваеннага складніку Арганізацыі і процідзеяння выклікам і пагрозам бяспекі, прамежкавыя вынікі работы па стварэнню Калектыўных сіл аператыўнага рэагавання (КСАР). Нагадаем, рашэнне пра стварэнне КСАР было прынята кіраўнікамі дзяржаў-сяброў АДКБ на пазачарговай сесіі Савета калектыўнай бяспекі 4 лютага бягучага года.**

**Пра ролю і выклікі для Беларусі ў сувязі з удзелам у ваенным саюзе пад эгідай Расіі з экспертам Раманам Якаўлеўскім размаўлялі Аляксей Караль і Вольга Хвоін.**



**Даведка**

Раман Якаўлеўскі. Аглядальнік часопіса «Kontrateksty» (Польша). Працаваў у першым у СССР інфармагенцве Postfactum, выданнях «Атмода» (Латвія), «Коммерсант», «Независимая газета» (Расія).

***— Пасля распаду Савецкага саюза і Варшаўскай дамовы Беларусь увайшла ў ваенны блок. Пагадненне пра стварэнне Калектыўных сілаў аператыўнага рэагавання АДКБ прадугледжвае ўдзел краінаў, якія падпісалі дамову, у ваенных дзеяннях на тэрыторыях, што ўваходзяць у сферу інтарэсаў Арганізацыі. Як ацаніць само рашэнне кіраўніцтва Беларусі ўступіць у ваенна-палітычны блок, калі і ў Канстытуцыі дзяржавы падобнае сяброўства не прадугледжана?***

— Хацеў бы нагадаць: тое, што мы сёння называем АДКБ, першапачаткова з'яўлялася Ташкенцкай дамовай па бяспецы. Дамова была падпісаная ў 1992 годзе ў Ташкенце. У яе ўвайшлі чатыры цэнтральнаазіяцкія краіны — Казахстан, Узбекістан, Таджыкістан і Кіргізія, а таксама Расія, Беларусь, Арменія. Праз нейкі час Узбекістан выйшаў з арганізацыі, затым зноў вярнуўся.

І вось апошняя навіна ад «Інтэрфаксу»: Узбекістан адмовіўся ад удзелу ў пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў МЗС АДКБ, бо, як паведаміла МЗС Узбекістана, «не бачыць мэтазгоднасці» ў гэтым пасяджэнні.

Уласна, Арганізацыя дамовы калектыўнай бяспекі сфарміравалася ў 2003 годзе. Ваенна-палітычным блокам, я лічу, АДКБ можна называць з нядаўняга часу, калі было прынятае рашэнне пра стварэнне сілаў хуткага рэагавання. Да гэтага падобныя спробы былі, але толькі на паперы. Чым адрозніваецца апошні варыянт? Вельмі дакладнай, прапісанай структурай сілаў хуткага рэагавання. Штаб будзе знаходзіцца ў Маскве, а самі сілы, па задуме, будуць дэлегавацца на тэрыторыю Расіі. Значэнне красавіцкай сустрэчы кіраўнікоў знешнепалітычных ведамстваў у Ерэване найперш у тым, што будзе дадзены адказ на пытанне, што ж канкрэтна зроблена за гэты час у межах дамовы. Я нагадаю: у межах АДКБ працуюць парламенцкія, міжведамасныя структуры, але гаварыць пра паўнавартасны ваенна-палітычны блок нельга. Як сказаў Лукашэнка, нам пакуль толькі марыць пра адзінства і высокую ступень кіравання, якія мае NATO. АДКБ — гэта правобраз ваенна-палітычнага блока, які Расія спрабуе выкарыстоўваць для захавання, а то і павелічэння свайго ўплыву, асаблівых інтарэсаў (што, між іншым, не хаваецца) на постсавецкай прасторы.

***— Што маецца на ўвазе пад «асаблівымі інтарэсамі»?***

— Расія разумее, што яна, у адрозненні ад іншых краінаў, найперш Захаду, мае свае асаблівыя інтарэсы ў Закаўказзі, Цэнтральнай Азіі, Беларусі, якія абумоўлены агульнай савецкай гісторыяй. Расія прапанавала такі пернік, як пераўзбраенне краін-чальцоў АДКБ па ўнутрырасійскіх, і нават з прэферэнцыямі, коштах. Гэта выгадна краінам-чальцам блока. Напрыклад, Кіргізія атрымала ад Расіі 1,7 мільярда долараў інвестыцый, а ўзамен прыняла рашэнне аб закрыцці ваеннай авіябазы «Манас» ЗША на сваёй тэрыторыі, тым самым пацвердзіўшы асаблівыя інтарэсы Расіі. Хацеў бы звярнуць увагу, што калі прымалася рашэнне пра стварэнне сілаў калектыўнага рэагавання, прэзідэнт Узбекістана Іслам Карымаў падпісаў дамову з умоваю, што па кожнай магчымай аперацыі Ташкент будзе прымаць асобнае рашэнне. Астатнія таксама падпісвалі не без агаворак, але, што тычыцца Беларусі, то ніхто не можа сказаць, на якіх дакладна ўмовах было падпісана пагадненне.

***— Асноўнымі мэтамі арганізацыі былі названыя захады па супрацьдзеянню тэрарызму, уключаючы накірунак Афганістану. Якая верагоднасць таго, што беларускія вайскоўцы будуць удзельнічаць у ваенных дзеяннях па-за тэрыторыяй Беларусі?***

— Каб было зразумела, што АДКБ не з'яўляецца паўнавартасным ваенна-палітычным блокам, нагадаю, што шэраг краінаў-чальцоў АДКБ удзельнічалі ў кааліцыйных сілах у Іраку (Казахстан і Арменія) і Афганістане. Калі гаварыць пра супярэчнасці айчыннага заканадаўства адносна ўдзелу вайскоўцаў у ваенных аперацыях за межамі краіны, то варта помніць, што ўказы прэзідэнта маюць прэрагатыву верхавенства. Таму гэтую сітуацыю можна ахарактарызаваць так: «Бог даў, бог узяў». Калі мяне пытаюцца, ці магчымы падобны ўдзел, то я шчыра адказваю, што не ведаю. Пра тое, якія ўказы можа прыняць Лукашэнка, ведае толькі ён сам, а інструментаў кантролю не існуе.

***— Наколькі рэальны варыянт увядзення войскаў АДКБ на тэрыторыі краінаў на постсавецкай прасторы?***

— У Беларусі, я думаю, гэта немагчыма. Пасля жнівеньскага ваеннага канфлікту з Грузіяй Расіі ісці на падобныя крокі немэтазгодна, яна і так не хутка разбярэцца з наступствамі агрэсіі.

***— Ну а, скажам, для аховы газапровода ад магчымых тэрарыстычных актаў?***

— У Расіі існуе закон аб узброеных фарміраваннях для аховы сваіх газаправодаў. Думаю, што Расія ў тым ліку і па гэтай прычыне так настойліва імкнецца набыць газатранспартную сістэму Украіны. Тады будуць усе падставы для ўвядзення ўзброенай аховы сваёй уласнасці.

Я хацеў бы нагадаць пра натаўскія бамбардзіроўкі Бялграда. Рашэнне пра ваенную акцыю прымалася з бласлаўлення пятнаццаці краінаў-чальцоў NATO. То бок была парламенцкая працэдура, а не нейкая сустрэча ў Сочы, дзе прымалася рашэнне, і ўсе ставіліся перад фактам. Ваенныя дзеянні ў Грузіі Дзярждума ўхваліла постфактум. Што тычыцца Беларусі, то я хацеў бы звярнуць увагу на нядаўні візіт у Мінск сакратара Савета бяспекі Расійскай Федэрацыі, былога дырэктара ФСБ Мікалая Патрушава, якога цікавіла, што і як тут дзеецца. Але падрабязнасці невядомыя. Я думаю, што небеспадстаўна будзе звязаць апасенні, пра якія мы гаворым, з візітам Патрушава.

***— А як наконт стварэння адзінай сістэмы СПА?***

— Калі мы кажам пра адзіную сістэму супрацьпаветранай абароны, то трэба гаварыць пра адзінае камандаванне. Рускія генералы ніколі не пойдуць у падпарадкаванне да беларускіх. Не можа быць агульнай знешняй палітыкі Расіі і Беларусі, бо мы знаходзімся ў розных вагавых катэгорыях і не заўсёды нашы інтарэсы супадаюць. Але Расія хоча паўсюдна прысутнічаць, і АДКБ для яе — інструмент уплыву, які яна імкнецца замацаваць, у тым ліку льготнымі коштамі на ўзбраенне. Я магу памыляцца, але ў дамове АДКБ няма артыкула пра тое, што нападзенне на адну краіну — з'яўляецца нападзеннем у цэлым на чальцоў арганізацыі.

***— Ці існуе перспектыва стварэння рэальнага і моцнага ваенна-палітычнага блока на базе АДКБ? Ці стане яна такім інструментам, якім яго бачыць Расія?***

— Я б не ўжываў да гэтай структуры азначэнне «паўнавартасная». Часта гавораць, што АДКБ — гэта анты-NATO. Але яны непараўнальныя ні па каардынацыі, ні па кансалідацыі інтарэсаў. NATO — саюз дзяржаў, які грунтуецца на агульных каштоўнасцях. Што тычыцца патэнцыялу АДКБ, то яго не варта перабольшваць. Уплыў Расіі на постсавецкай прасторы, безумоўна, павялічыўся, але не факт, што яна дасягне пастаўленых мэтаў з дапамогай гэтага блоку. Як прыклад, Расія наклала вета на працу АБСЕ ў Грузіі, матываваўшы гэта новымі ўмовамі і неабходнасцю арганізацыі працы асобных місій у Тбілісі, Цхінвалі і Сухумі. Але ніхто яе ў гэтым рашэнні не падтрымаў. Узнікае пытанне, а што рабіла Беларусь? Мы гэтага не ведаем. Між іншым, незалежнасць Паўднёвай Асеціі і Абхазіі ніхто з сяброў АДКБ таксама не падтрымаў. Якую вагу можа мець арганізацыя, калі яе сябры не маюць адзінства?

***— Многія аналітыкі гавораць, што Лукашэнка ўдзельнічае ў расійскіх гульнях, але ніколі не пойдзе на стварэнне адзінай СПА, не паставіць тут дадатковыя ракетныя комплексы, не ўвядзе адзіную грашовую сістэму, то бок ён таксама выкарыстоўвае Расію дзеля дасягнення сваіх мэтаў.***

— Тое, што незалежнасць Беларусі ў яго разуменні, гэта яго ўлада — відавочна. Што тычыцца ўстаноўкі ракет найноўшага пакалення С–400, то спачатку ён заяўляў, што на гэта няма грошай, цяпер гаворыць, што праект прафінансуе Расія. Але адказаў на яго каментары з расійскага боку не чуваць. Расія наўрад ці пойдзе на дысбаланс статус-кво ў Еўропе, нават калі будуць усталяваныя натаўскія СПА ў Польшчы. Навошта Расіі станавіцца закладнікамі Лукашэнкі, размяшчаючы тут свае ракетныя комплексы, даваць яму ў рукі навейшае ўзбраенне, калі гэта можна зрабіць на сваёй тэрыторыі ў Калінінградзе? Па-мойму, гэта шалёная прапаганда.

Што тычыцца сумеснай СПА, то адказу на пытанне, хто будзе камандаваць адзінай сістэмай, няма. Апошнім часам ужываецца азначэнне «рэгіянальная» СПА. Але Расія не будзе драбніць сваю сістэму супрацьпаветранай абароны дзеля Беларусі. З аднаго боку, прыемна знаходзіцца пад расійскім ядзерным парасонам, але з іншага — хто будзе нападаць на Беларусь? Пагроза ад NATO надуманая. Калі ж пытаюцца, навошта тады разварочваць СПА ў Польшчы, я адказваю: не чакаць жа, пакуль іранскія ракеты пачнуць лётаць над Еўропай.

***— Якая на сёння рэакцыя Захаду на стварэнне вайсковага саюза фактычна пад кіраўніцтвам Расіі?***

— ЗША ставяцца да гэтага паблажліва, бо рэальна ацэньваюць магчымасці і патэнцыял як краінаў, што ўваходзяць у АДКБ, так і Расіі. Трывогу праяўляюць балтыйскія краіны, але яны могуць спаць спакойна, бо ўваходзяць у NATO, і пяты артыкул Вашынгтонскай дамовы гарантуе ім абарону. Хацеў бы адзначыць, што ўсе спробы наладзіць адносіны АДКБ з NATO пакуль няўдалыя, бо апошняя імкнецца развіваць двухбаковыя адносіны з краінамі-ўдзельніцамі АДКБ, а да таго ж не бачыць у АДКБ структуры, якую трэба было б браць у разлік.

***— Беларусь уступае ў ваенна-палітычны блок, у якім істотную ролю мае ўзровень арганізацыі арміі, яе стан...***

— Беларуская армія, як нас пераконваюць, адна з самых баяздольных на постсавецкай прасторы і нават у Еўропе. Але вось адзін толькі і амаль што побытавы факт, які зводзіць на нішто ўсю прапаганду: выпускнікі вайсковых вучэльняў краіны па традыцыі падкідваюць манеты. У нас у абарачэнні толькі папяровыя грошы, узнікае пытанне: манеты якой краіны падкідваюць маладыя афіцэры, прымаючы прысягу Рэспублiцы Беларусь?



УГОДКІ



# РЭГІЯНАЛЬНАЕ РЭХА ЧАРНОБЫЛЬСКАГА ШЛЯХУ

Вольга ХВОІН

**На ўгодкі Чарнобыльскай трагедыі лідэры палітычных партый з'едуць са сталіцы ў рэгіёны. Акцыі 26 сакавіка пройдуць у Магілёўскай, Гродзенскай і Гомельскай абласцях.**

У Мінску арганізатары Чарнобыльскага шляху заклікаюць людзей прыйсці 26 красавіка ў 12.00 да Акадэміі навук, адкуль мусіць распачацца шэсце па праспекце Незалежнасці да плошчы Якуба Коласа, затым па вуліцах Веры Харужай, Багдановіча і Кульман да Чарнобыльскай капліцы. Завершыцца акцыя мітынгам. Аргкамітэт падрыхтаваў удзельнікам Шляху неспадзяванкі, але пра іх сэнс можна будзе даведацца на месцы.

Сёлета арганізатары Чарнобыльскага шляху робяць акцэнт на такія фактары, як эканамічны крызіс, наступствы аварыі на ЧАЭС і будаўніцтва атамнай станцыі ў Беларусі. У Гродзенскай вобласці мерапрыемствы пройдуць у асноўным у Астраўцы, недалёка ад якога можа быць пабудаваная АЭС. У мястэчка для сустрэчы з жыхарамі арганізатары кампаніі «Чарнобыль–2009» збіраюцца запрасіць навукоўцаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, спецыялістаў з Расіі і Літвы, прадстаўнікоў улады. Саматужныя спробы мясцовых актывістаў арганізаваць інфармацыйную кампанію дагэтуль заканчваліся паразамі. Так, нядаўна ў Міністэрстве інфармацыі прынялі рашэнне знішчыць наклад канфіскаванага бюлетэня «Астравецкі веснік», у якім падымаецца тэма будаўніцтва атамнай станцыі.

У Гомелі запланавана правесці мітынг, пададзена адпаведная заяўка ў гарвыканкам. Плануецца, што 24–25 красавіка разам з лідэрамі Аб'яднаных дэмакратычных сілаў (старшынёй Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатолем Лябедзькам, кіраўніком Партыі камуністаў Беларускай Сяргеем Калякіным і палітыкам Аляксандрам Казуліным) кіраўнікі і лідэры абласной кааліцыі наведаюць раёны Гомельскай вобласці, якія найбольш пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС.

У Магілёве мяркуецца зладзіць невялікі мітынг, а ў мясцовых касцёле і царкве замовіць службы па ахвярах чарнобыльскай трагедыі.

Да кампаніі «Чарнобыль–2009» збіраюцца далучыцца індывідуальныя прадпрымальнікі. Намеснік старшыні грамадскай арганізацыі «За вольнае развіццё прадпрымальніцтва» (Кіеў, Украіна) Віктар Калей адзначыў, што эканамічны крызіс адбіўся на справах дробных прадпрымальнікаў. «Сённяшнія пытанні крызісу ўшчыльную звязаныя з палітычнымі рашэннямі ўрада. Таму мы цалкам падтрымліваем правядзенне Чарнобыльскага шляху. Калі летась гэта было некалькі разрознена, то цяпер крызіс прымушае нас аб'ядноўвацца», — цытуе словы прадпрымальніка БелаПАН.

Пры ўсёй маштабнасці агучаных планаў палітык і адзін з суzaснавальнікаў партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» Павел Севярынец адзначае, што за апошнія гады ўзровень арганізацыі Чарнобыльскага шляху значна пагоршыўся: «На жаль, Чарнобыльскі шлях ператвараецца ў рытуальныя акцыі. Хацелася б эфектнасці, яркіх ідэй, нестандартнасці, крэатыву. Вельмі не хапае інфармацыйнай працы з мэтавымі групамі: чарнобыльцамі, жыхарамі забруджаных тэрыторый». Павел Севярынец гаворыць, што прэтэнзіі могуць быць да арганізатараў акцыі, БХД да ўдзелу ў акцыі не запрашалі, але прадстаўнікі гэтай палітычнай сілы будуць прысутнічаць, «хаця апошнім часам не зразумела, якім чынам адбываецца арганізацыя Шляху».

Моладзевы актывіст са Смалявічаў Яўген Пугач удзельнічае ў многіх акцыях апазіцыі. На пытанне пра тое, чаго не хапае ў арганізацыі акцыі, адказвае, што людзям не зразумела, навошта туды ісці. «Да ўсяго даверу да цяперашніх партыйных кіраўнікоў мала. «Людзі не дурні і разумеюць, што і па чым у краіне. І хадзіць на акцыі апазіцыі пачнуць тады, калі з'явіцца аўтарытэтны лідэр, які ўцямна патлумачыць, навошта ісці на вулічную акцыю і які вынік з гэтага будзе».

Зладзіць візіты палітыкаў у рэгіёны — надзвычай пазітыўнае рашэнне. Толькі зрабіць гэта было б варта загадзя, каб падрыхтаваць людзей да галоўнай акцыі — Чарнобыльскага шляху ў Мінску — і не размазваць яе па ўсёй Беларусі. Але і такі падыход усё ж значна лепшы за бясконцыя паседжанні за «круглымі сталамі» і ў рознага кшталту «радах».




## ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

# НІ ПРАЕХАЦЬ НІ ПРАЙСЦІ

**У рэдакцыю «НЧ» з просьбай агучыць гісторыю адстойвання сваіх правоў у асобна ўзятым мястэчку звярнуўся жыхар вёскі Дукора Пухавіцкага раёна Сяргей Шостак. Ніжэй прыводзім ліст чытача з невялікімі скарачэннямі. Копіі дакументаў, якія фігуруюць у апісанай справе, знаходзяцца ў рэдакцыі.**

У нашай краіне існуе два меркаванні адносна магчымых сацыяльных пераменаў у бліжэйшай будучыні. Адны лічаць, што тут квітнее «беларускі цуд», якому перашкаджаюць нешматлікія крыкуны, адмарозкі і няўдачнікі. Іншыя ўпэўненыя, што ў Беларусі — дзве краіны. Кіраваць рэспублікай з дапамогай адміністрацыйна-каманднай сістэмы з кожным днём становіцца ўсё складаней. Палітычная сістэма, якую стварыў Аляксандр Лукашэнка, не можа быць мадэрнізаваная і дэмакратызаваная. Гэта аналаг сістэмы, якая існавала ў Савецкім Саюзе. Нават калі Лукашэнка захоча нешта змяніць, яму гэтага не прабачаць яго ж паплечнікі. Мой прыклад даказвае тое.

Больш за тры гады таму я працаваў у СПК «Дукора» юрысконсультам і выступіў супраць старшыні Пухавіцкага райвыканкама З. А. Турко і старшыні СПК «Дукора» З. У. Дамарада, якія, мякка кажучы, злоўжылі сваімі службовымі паўнамоцтвамі. У 2005 годзе яны фактычна падаравалі прадпрымальніку І. У. Немагаю сажалку ў в. Дукора плошчаю 11 га. Матэрыяльныя страты гаспадаркі склалі 116 мільёнаў рублёў (балансавы кошт сажалкі). Каб выпатрабаваць сажалку назад, мне давялося неаднаразова звяртацца ў пракуратуру Пухавіцкага раёна і пракуратуру Мінскай вобласці.

Справа дайшла да таго, што З. У. Дамарад забраў з канцылярыі абласной пракуратуры бандэроль з доказамі незаконнай перадачы сажалкі, але ён не ведаў, што ў мяне ёсць апавяшчэнне пра атрыманне бандэролі пракуратурай. Пракурор выявіў парушэнне закона і рэкамендаваў «сябрам кіраўніцтва СПК «Дукора» звярнуцца ў суд». Аднак права першага подпісу ў З. У. Дамарада ніхто не забраў. Таму ён, замест звароту ў суд, спачатку пазбавіў мяне часткі заробку, забараніў спецыялістам гаспадаркі даваць мне ў рукі дакументы, «выселіў» з кабінета, а пасля і зусім «скараціў» з пасада юрысконсульта. Пракурор раёна Матуляк не ўгледзела ў гэтым ніякага парушэння заканадаўства.

Пасля майго звальнення пасада юрысконсульта была адноўленая, і цяпер вакансія занятая. За тое, што я надаў галоснасць несамавітым учынкам, па заяве Дамарада мяне спрабавалі пасадзіць на лаву падсудных за паклёп, але мае доказы апынуліся настолькі пераканаўчымі і пэўнымі, што нават службоўцы не адважыліся падтрымаць кіраўніка.

Тады мае апаненты пайшлі іншым шляхам. Яны выселілі з жылля шматдзетную сям'ю Бандолік — маіх сведак па справе аб злоўжываннях старшыні СПК З. У. Дамарада. Мікалай Валянцінавіч Бандолік — лепшы механізатар СПК «Дукора» 2005 года, дэлегат трэцяга Усебеларускага народнага сходу 2006 года, чарнобылец з зоны адсялення — па надуманых матывах разам з жонкай-даяркай быў спачатку пазбаўлены працы, а потым апынуўся на вуліцы. Цяпер у вёсцы Дукора ідзе збор подпісаў пад зваротам да старшыні Мінскага аблвыканкама Крупца.

Прывяду вытрымкі з гэтага дакумента: «Мы, ніжэйпадпісаныя грамадзяне Рэспублікі Беларусь, жыхары вёскі Дукора Пухавіцкага раёна, выказваем свой рашучы пратэст супраць млявага «будаўніцтва» аграгарадка ў нашым населеным пункце. Фармальна, з дапамогай ашуканства, аграгарадок быў здадзены ў эксплуатацыю ў 2005 годзе. Камісія службоўцаў штотыдзень па чацвяргах засядала ў канторы СПК «Дукора». Усе службы раёна рапартавалі пра гатоўнасць аб'екта да здачы ў эксплуатацыю. Рашэнне не прымусіла сябе доўга чакаць: камісія падпісала акт прыёмкі. Аднак вынік уражвае нават франтавікоў. Па дукорскіх дарогах ні праехаць ні прайсці. Дамыкатэджы — суцэльная халтура, людзі з'язджаюцца для атрымання жылля з ўсёй рэспублікі. Як правіла, гэта сем'і з вялікімі праблемамі. Карэнных дукорцаў у горадаўтваральнай гаспадарцы амаль не засталося. Цякучасць кадраў агаляе безгрунтоўнасць кіраўніцтва гаспадаркі. Напрыклад, галоўны заатэхнік мяняецца на працягу апошніх чатырох гадоў. Мы ўжо не гаворым, што пры будаўніцтве аграмястэчка не выкананы прынятыя дзяржавай стандарты. Цеплатраса ўсю зіму знаходзіцца ў раскапаным стане».

Магчыма, гэты ліст паўторыць лёс нашых папярэдніх зваротаў у розныя інстанцыі — мы дайшлі аж да Адміністрацыі прэзідэнта. Усе яны накіроўваюцца да тых службоўцаў, на якіх скардзяцца грамадзяне.

Думаю, што цяпер надышоў час ахвярнасці для прадстаўнікоў апазіцыі. Напрыклад, Аляксандр Казулін сваім учынкам пасля прэзідэнцкіх выбараў зрабіў значна больш для цывілізаванай еўрапейскай Беларусі, чым усе апазіцыянеры, якія засядаюць у грамадска-кансультатыўнай радзе пры Адміністрацыі прэзідэнта, разам узятыя. Мой таварыш Сяргей Абразоўскі, які падняў жыхароў пасёлкаў Дружны і Свіслач супраць будаўніцтва хімічнага завода «Аўгуст-бел» у 30 кіламетрах ад Мінска. Яго чатыры разы прыцягвалі да адміністрацыйнай адказнасці, аднак каля тысячы чалавек прыйшлі падтрымаць яго на мітынг. Для маленькіх пасёлкаў гэта вельмі шмат. На жаль, іншым шляхам у бліжэйшай будучыні мы наўрад ці чаго даможамся для Беларусі.

**Падрыхтавала Марыя Крук**

▸ МЕРКАВАННЕ

# АДСТАЎКА НАВУМАВА ЯК ІНДЫКАТАР ПЕРАМЕНАЎ У ПАЛІТЫЦЫ І ЎЛАДНАЙ ЭЛІЦЕ

Андрэй ЛЯХОВІЧ

**Фармальнае тлумачэнне адстаўкі міністра ўнутраных спраў Уладзіміра Навумава стомленасцю і «запрацаванасцю» выклікала шквал крытыкі і ані кроплі даверу, бо яшчэ зусім нядаўна экс-міністр дэманстраваў выдатную фізічную форму сваімі пешымі марафонамі. Журналісты і аналітыкі агучылі шэраг версій сыходу аднаго са старэйшых чальцоў каманды Аляксандра Лукашэнкі. Прапануем вашай увазе артыкул палітолага Андрэя Ляховіча, у якім ён дае свае тлумачэнні ратацыі кадраў у эшалонах улады і магчымых наступстваў для краіны ад гэтых пераменаў.**









Photo.ByMedia.Net





## Прадвызначаная адстаўка

Наўрад ці падставай для адстаўкі стала нядаўняе распаўсюджванне ў інтэрнэце звароту ананімных супрацоўнікаў праваахоўных органаў, у якім выказваліся прэтэнзіі да працы Навумава. Таксама ёсць падставы сумнявацца ў іншых чынніках адстаўкі, якія называюць аналітыкі. У прыватнасці, сцвярджаецца, што пад кіраўніцтвам Навумава так і не было раскрыта самае гучнае злачынства апошняга часу — выбух на афіцыйным канцэрце ў Дзень незалежнасці 3 ліпеня 2008 года.

Аднак расследаванне гэтага здарэння павінна было знаходзіцца ў кампетэнцыі не МУС, а КДБ, як і кожная крымінальная справа, распачатая па артыкулах «тэрарызм» і «замах на жыццё вышэйшых службовых асобаў». Тое, што на Уладзіміра Наумава было ўскладзенае кіраванне расследаваннем, азначала, што ўжо ў ліпені 2008 года ён быў «казлом адпушчэння». Яго адстаўка была прадвызначана яшчэ ў той час.

Версія, што адхіленнем Навумава ад пасады Лукашэнка хоча залагодзіць Захад, каб паехаць у Прагу на саміт «Усходняга партнёрства», з'яўляецца праўдзівай толькі часткова. Улада імкнецца весці дыялог з Захадам, але па шэрагу прычынаў Лукашэнка не збіраецца ехаць у Прагу. Рэпрэсіямі ў лютым ён паказаў, што будзе весці дыялог, дэманструючы сілу сваіх пазіцый. Асабіста паехаць у Прагу азначала б для яго прадэманстраваць сваю слабасць.

## Ратацыя кадраў

Адстаўка Навумава з'яўляецца заканамернай у святле пераменаў, што адбываюцца ў Беларусі. З аднаго боку, улада хоча ўказаць Захаду на гэтыя перамены, з іншага — адстаўка з'яўляецца галоўнай праявай тых пераменаў, пра якія афіцыйны Мінск не гаворыць. Але менавіта гэтыя перамены вызначаюць характар развіцця сітуацыі ў краіне. Найперш гэтым крокам улада дае пазітыўны сігнал для Захаду. Гаворыць, што зацікаўлена ў працягу дыялогу, што будзе сама змяняцца «ў лепшы бок», калі дыялог працягнецца, а Беларусь уключаць у праграму «Усходняга партнёрства». Ад пасад адхіляюць асобаў, наяўнасць якіх ва ўладзе стварае праблемы ў развіцці адносін з Захадам. Уладзімір Навумаў — апошні высокапастаўлены фігурант справы аб палітыках-суперніках Лукашэнкі, якія зніклі ў 1999 годзе (у той час Навумаў узначальваў службу бяспекі прэзідэнта).

Гэта ратацыя кадраў паказвае на моцныя пазіцыі групаў у складзе кіруючай эліты, якія выступаюць за аўтарытарную мадэрнізацыю, за падкантрольную павольную палітычную лібералізацыю. Маецца на ўвазе група сына прэзідэнта Віктара Лукашэнкі і група тэхнакратаў на чале з прэм'ер-міністрам Сяргеем Сідорскім. Яны ініцыявалі буйныя ратацыі ў складзе сілавых і кантрольных структур, каб правесці наверх сваіх прызначэнцаў.

Роля сілавых (КДБ, МУС) і кантрольных (Камітэт дзяржкантролю, пракуратура) структур у палітычнай сістэме Беларусі зніжаецца. Яны знаходзяцца пад кантролем груп, якія выступаюць за асцярожныя,ралічаныя, але ўсё ж змены ў Беларусі. Навумаў быў апошнім прадстаўніком калісьці магутнай групы сілавікоў і кантралёраў на чале з дзяржаўным сакратаром Рады бяспекі Віктарам Шэйманам. Адхіленне Уладзімера Навумава — апошні крок у поўным падпарадкаванні кантралёраў і сілавікоў.

## Суадносіны сіл

Чым больш падкантрольнымі тэхнакратам і групе Віктара Лукашэнкі станавіліся кантрольныя і сілавыя структуры, тым больш актыўныя крокі рабіліся ў кірунку эканамічнай лібералізацыі. Атрымалася пазбавіцца ад прэсінгу сілавікоў і кантралёраў у дачыненні дырэктарскага корпуса, усё малаверагодней становіцца антыкарупцыйная кампанія супраць эканамічнай эліты. Можна сказаць, што гэтым ствараюцца дадатковыя ўмовы для эканамічнай лібералізацыі.

Працяг чысткі ў складзе кантрольных і сілавых структур паказвае на тое, што прыярытэтамі дзяржаўнай палітыкі з'яўляецца эканамічная мадэрнізацыя, паляпшэнне структуры і якасці (інстытуцыянальных і функцыянальных характарыстык) дзяржаўнага апарата. Эканамічныя менеджэры-тэхнакраты, юрысты і дыпламаты запатрабаваныя, уплывовыя. У адрозненні ад сілавікоў і кантралёраў, якія апынуліся на другіх, падпарадкаваных ролях.

Характэрна, што ўлетку 2007 года хадзілі чуткі, што У. Навумаў будзе прызначаны прэм'ер-міністрам. Аднак было зразумела, што Навумаў не зменіць Сідорскага.

У цэлым улада ў Беларусі становіцца больш прагматычнай, больш гатовай да інавацый, зменаў. У тым ліку падвышаецца верагоднасць крокаў з боку ўлады ў кірунку палітычнай лібералізацыі. Бо бачны моцны ўплыў тых, хто ў стане пралічыць гэтыя крокі і іх наступствы.

## Тэндэнцыі

У складзе ўлады ўзмацняецца прадстаўніцтва тых, хто гаворыць па-беларуску, лічыць сябе беларусам і еўрапейцам (дастаткова ўзгадаць адпаведныя заявы кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Уладзіміра Макея), хто ведае гісторыю Беларусі ў яе несавецкім разуменні. Улада будзе працягваць «забіраць» у апазіцыі тэму беларускай гісторыі, культуры, мовы. Кшталту таго, як раней забралі тэму незалежнасці Беларусі.

Уладзімір Навумаў — выходзец з Расіі (са Смаленску). Ён не прамовіў ніводнага слова па-беларуску, у адрозненні ад Макея, які выступае па-беларуску, і нават Лукашэнкі, які ўжывае беларускія словы (напрыклад, «фанабэрыстыя расіяне»). Прыйшоў час, калі быць ва ўладзе выключна рускамоўным, не ведаць беларускай, не гаварыць нават «на трасянцы» азначае вылучацца ў горшы бок.

Адстаўка Навумава пацвярджае, што ў складзе ўлады няма груп, якія маглі б выступаць у ролі лабістаў расійскіх інтарэсаў, за «сапраўдную» інтэграцыю, як гэтага хоча Расія. Улада досыць кансалідаваная, што тычыцца незалежнасці Беларусі. Таму Беларусь не зробіць крокаў у накірунку «сапраўднай» інтэграцыі з Расіяй. Не будзе складзены пад дыктоўку Масквы «Канстытуцыйны акт Саюзнай дзяржавы». Не адбудзецца аб'яднання грашовых сістэм. Беларусь не перадасць пад кантроль Расіі бюджэтаўтваральныя прадпрыемствы.

Беларусь будзе дэманстратыўна таптацца на месцы ў пытаннях ваеннай інтэграцыі, праводзіць сумесныя вучэнні, каб дэманстраваць ролю «шчыта» супраць NATO і адзінага саюзніка. Але пры гэтым не аддасць пад кантроль усходняй суседкі сваю сістэму СПА. Не пойдзе на павелічэнне ваеннай прысутнасці Расіі, не адправіць вайскоўцаў праліваць кроў за інтарэсы АДКБ, то бок Расіі. І рэжым Лукашэнкі не прызнае незалежнасць Паўднёвай Асеціі і Абхазіі, бо не хоча быць прывязаным да Расіі, не хоча, каб яго лічылі марыянеткай.

У выніку захоўваецца верагоднасць чарговага газавага канфлікту з Расіяй. У выпадку ціску з боку Расіі, прад'яўлення непрымальных патрабаванняў, як гэта было ў студзені 2004 года, Беларусь адкажа на той жа мове, што і тады. Як вынік, не варта чакаць, што Расія вылучыць на прэзідэнцкіх выбарах 2010 года ў Беларусі свайго кандыдата. Яна будзе пасіўна або актыўна падтрымліваць кандыдатуру Аляксандра Лукашэнкі.

**Ратацыя кадраў паказвае на моцныя пазіцыі групаў у складзе кіруючай эліты, якія выступаюць за аўтарытарную мадэрнізацыю, за падкантрольную павольную лібералізацыю**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 20 КРАСАВІКА, ПАНЯДЗЕЛАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.30** У свеце матораў.
**09.05, 13.55**«Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Nota Bene.
**09.35** «Зорныя танцы».
**11.00** Меладраматычны серыял «Два бакі адной Ганны» (Украіна).
**12.10** Лірычная камедыя «Урокі спакушэння» (Украіна - Расія).
**14.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё». «Мой нелюбімы школьны настаўнік».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30** Культурныя людзі.
**16.05** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**16.50** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.50** Меладраматычны серыял «Два бакі адной Ганны» (Украіна).
**18.50, 01.20** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** Ток-шоў «Ход у адказ».
**21.00** Панарама.
**21.50, 01.40** Драматычны серыял «Доктар Хаўс» (ЗША).
**23.00** Драматычны баявік «Доказ жыцця» (ЗША).
**01.30** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 22.50, 00.25** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Дыханне планеты».
**10.40** Мультфільм.
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.05** «Малахаў+».
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Хачу ведаць».
**15.10** «Гарачы лёд». Шматсерыйны фільм.
**16.15** «Песні маёй краіны».
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?» (Расія), 2005 год. Закл. серыя.
**19.05** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Выбар».
**22.05** «След». Шматсерыйны фільм.
**23.05** Навіны спорту.
**23.10** «Зваротны адлік».
**23.40** «Місія празорлівасці». Шматсерыйны фільм.
**00.40** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень».
**09.30** «Вялікі сняданак».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.55** «Танга ўтрох». Тэленавэла.
**11.45** «Сіла прыцягнення». Серыял.
**12.40** «Званая вячэра».
**13.50** Фільм «Слухаючы цішыню». Расія.
**15.35** «Я - вандроўца».
**16.00** «Культурнае жыццё».
**16.50** «Спартыўны тыдзень».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Сіла прыцягнення». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Мужчына павінен плаціць».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**00.25** «Гучная справа».

### ЛАД

**06.55** «ЛАДная раніца».
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.25** Тэлебарометр.
**08.40** Усё аб бяспецы.
**09.10** У гэты дзень.
**09.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.10** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.00** Сямейная меладрама «Крылы Анёла» (Украіна). 1-я і 2-я серыі.
**12.50** Слова пісьменніка.
**13.15** Прыгодніцкі дэтэктыў «Сустрэчная паласа» (Расія). 1-я серыя.
**14.15** Бухта капітанаў.
**14.55** Пазакласная гадзіна.
**15.10** Таемны густ.
**15.40** Экспедыцыя.
**16.10** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.05** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дэтэктыўны серыял «Тэрмінова ў нумар!» (Расія).
**19.55** Беларуская часіна.
**20.55** Калыханка.
**21.15** Экспедыцыя.
**21.20** Камедыя «Уімблдон» (Вялікабрытанія - Францыя).
**23.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
**00.05** Хакей. Формула гульні.

### РОССИЯ

**07.00** «Мір усім!». Дакументальны фільм.
**07.30** Фільм «Калі мне будзе 54 гады». 1989 г.
**09.00** Тэлесерыял «Карменіта».
**09.50** Тэлесерыял «Калі яе зусім не чакаеш».
**10.40** «Ранішняя пошта».
**11.10** Тэлесерыял «Трое супраць усіх».
**12.00** Фільм «Дробязі жыцця». 1980 г.
**13.10** «Дарыць свята». Дак. фільм.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Кулагін і партнёры».
**14.55** «Правілы самай абаяльнай і прываблівай. Ірына Мураўёва». Дак. фільм.
**15.50** «Мастацтва быць смешным». Дакументальны фільм.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Сумленны дэтэктыў».
**17.55** Тэлесерыял «Лэдзі Бос», 2001 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Карменіта».
**20.30** Тэлесерыял «Калі яе зусім не чакаеш».
**21.30** Тэлесерыял «Трое супраць усіх».
**22.35** «Кулагін і партнёры».
**23.10** «Весткі+».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «Апошняя роля. Георгій Юматаў». Дакументальны фільм.
**00.30** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**09.00** «Ала Пугачова: Прызнанні жанчыны, якая спявае».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Кулінарны паядынак».
**11.15** «Кватэрнае пытанне».
**12.10** «Следства вялі...».
**13.00** Сёння.
**13.35** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**15.05** Проста цырк.
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Працяг будзе».
**18.10** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.40** Прэм'ера. Крымінальны серыял «Ліцэйны».
**21.55** «Сумленны панядзелак».
**23.00** Сёння.
**23.25** «Ты не паверыш! Ньюс».
**23.50** Драматычны серыял «Палюбоўніца».
**00.40** Камедыйны серыял «Не сварыцеся, дзяўчынкі».
**01.25** «Школа зласлоўя».

### EUROSPORT

**09.30** Мотаспорт па выходных.
**10.45** Тэніс. Турнір WTA у ЗША (Чарльстон). Фінал.
**11.00** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 2-і дзень.
**12.00** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі. 3-і дзень. Прамая трансляцыя.
**15.00** Веласпорт. Велагонка «Amstel Gold».
**16.30** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі. 3-і дзень. Прамая трансляцыя.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.45** Футбол. Еўрагалы.
**20.00** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 3-і дзень.
**21.15** Вось дык так!!!
**21.30** Армрэстлінг. PAL/NAL.
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection.
**23.30** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Total Knock Out.
**00.30** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 3-і дзень.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Аб'ектыў.
**18.10** Серыял «Ранча».
**19.00** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Хрысціянства».
**19.05** Тыдзень з радыё «Свабода».
**19.35** Дак. фільм «Гарадоцкія валачобнікі». Польшча, 2007 г.
**19.50** Канцэрт царкоўнай музыкі. Ч. 3.
**20.20** Дак. фільм «Невядомая Беларусь»: «Кіпіць Нямігa». Беларусь, 2009 г.
**20.45** Асабісты капітал.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** «Без рэтушы»: «Манастыр». Польшча, 2008 г.
**21.40** Маст. фільм «Астэрыкс на алімпіядзе». Францыя–Іспанія–Германія, 2008 г.
**23.40** Тэлесерыял «Элі Макбіл».
**00.25** Аб'ектыў.

## 21 КРАСАВІКА, АЎТОРАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.05, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**10.00** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**10.50** Меладраматычны серыял «Два бакі адной Ганны» (Украіна).
**11.40** Відэафільм АТН «Мсціслаўскі шлях» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**13.05** Камедыйны серыял «Монк» (ЗША).
**14.05** Ток-шоў «Ход у адказ».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** «Вера. Надзея. Каханне». Дакументальны фільм (Беларускае тэлебачанне).
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Капкан» (Расія).
**16.55** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.50** Меладраматычны серыял «Два бакі адной Ганны» (Украіна).
**18.50, 00.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.50, 01.10** Драматычны серыял «Доктар Хаўс» (ЗША).
**22.55** Гістарычны баявік «Бясстрашны» (Кітай - Ганконг -- ЗША).
**00.55** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 22.50, 00.25** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Чакай мяне».
**10.05** «Дзікія дзеці».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Адзін супраць усіх».
**12.00** «Малахаў+».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Хачу ведаць».
**15.10** «Гарачы лёд». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Агонь кахання». Шматсер.фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Гуманоіды ў Каралёве». Расія, 2008 год.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Шальны анёл». Шматсерыйны фільм.
**22.05** «След». Шматсерыйны фільм.
**23.05** Навіны спорту.
**23.10** «Геніі і злыдні».
**23.40** «Місія празорлівасці». Шматсерыйны фільм.
**00.40** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** Фільм «Мужчына павінен плаціць». Расія, 2007 г.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.55** «Танга ўтрох». Тэленавэла.
**11.45** «Сіла прыцягнення». Серыял.
**12.40** «Званая вячэра».
**13.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**14.20** «Далёкія сваякі».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Сіла прыцягнення». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Смерць шпіёнам - 2». Серыял.
**21.40** «Аўтапанарама».
**22.00** «Вайна. Вядомая і невядомая». «Святая вайна». Фільм трэці.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**23.55** «Надзвычайныя гісторыі».

### ЛАД

**06.55** «ЛАДная раніца».
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Дэтэктыўны серыял «Тэрмінова ў нумар!» (Расія).
**09.10** У гэты дзень.
**09.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.10** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**10.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
**11.50** Хакей. Формула гульні.
**12.20** Кінараман "Вяртанне Будулая" (СССР). 1-я серыя.
**13.45** Прыгодніцкі дэтэктыў «Сустрэчная паласа» (Расія). 2-я серыя.
**14.40** Мультсерыял «Аладзін» (ЗША).
**15.05** Пазакласная гадзіна.
**15.15** Бітва экстрасэнсаў.
**16.10** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.05** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дэтэктыўны серыял «Тэрмінова ў нумар!» (Расія).
**19.55** Беларуская часіна.
**20.55** Калыханка.
**21.15** Экспедыцыя.
**21.20** Спорт-кадр.
**21.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Ліверпуль - Арсенал. Прамая трансляцыя.
**23.55** Трагікамедыя «Старыя» (Расія).

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** Тэлесерыял «Карменіта».
**10.10** Тэлесерыял «Калі яе зусім не чакаеш».
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Трое супраць усіх».
**12.30** Дэтэктыў «Падвойны капкан». 1985 г. 1-я серыя.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Кулагін і партнёры».
**14.55** «Свята ў чаканні свята. Фазіль Іскандэр». Дакументальны фільм.
**15.50** «Шынок Краіны Саветаў». Дак. фільм.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Вандраванні натураліста».
**17.55** Тэлесерыял «Лэдзі Бос», 2001 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Карменіта».
**20.30** Тэлесерыял «Калі яе зусім не чакаеш».
**21.30** Тэлесерыял «Трое супраць усіх».
**22.35** «Кулагін і партнёры».
**23.10** «Весткі+».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** Прэм'ера. «Геній рускага дзюдо. Спорт і разведка». Дакументальны фільм.
**00.30** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**09.00** «Дачны адказ».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.50** «Жаночы погляд».
**11.20** Дэтэктыўны серыял «Залатыя хлопцы».
**12.10** Драматычны серыял «Палюбоўніца».
**13.00** Сёння.
**13.35** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**15.05** Проста цырк.
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** Дэтэктыўны серыял «Працяг будзе».
**18.05** «Ты не паверыш! Ньюс».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.40** Прэм'ера. Крымінальны серыял «Ліцэйны».
**21.55** «Вочная стаўка».
**23.00** Сёння.
**23.25** «Ты не паверыш! Ньюс».
**23.50** Драматычны серыял «Палюбоўніца».
**00.40** Камедыйны серыял «Не сварыцеся, дзяўчынкі».

### EUROSPORT

**09.30** Вось дык так!!!
**09.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**10.30** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 3-і дзень.
**12.00** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 4-ы дзень. Прамая трансляцыя.
**15.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**15.45** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 3-і дзень.
**16.30** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 4-ы дзень. Прамая трансляцыя.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.15** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 4-ы дзень. Прамая трансляцыя.
**19.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**20.15** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 4-ы дзень.
**21.00** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 4-ы дзень. Прамая трансляцыя.
**00.00** Бокс. Міжнародны паядынак у Вялікабрытаніі (Лондан).
**01.00** Аўтагонкі. Сусветная серыя (Рэно) у Іспаніі (Барселона). Агляд.
**01.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**02.15** Вось дык так!!!

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Аб'ектыў.
**18.10** Тэлесерыял «Элі Макбіл».
**18.55** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Хрысціянства».
**21.40** Маст. фільм «Астэрыкс на алімпіядзе». Францыя–Іспанія–Германія, 2008 г.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Хто ёсць кім?: Лера Сом.
**21.30** Еўропа сёння.
**22.05** Госць «Белсату».
**22.25** Сальда.
**22.45** Тэлесерыял «Элі Макбіл».
**23.30** Кухня.

## 24 КРАСАВІКА, ПЯТНІЦА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 19.30, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.05, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія). Заключная серыя.
**10.05** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**10.55** Меладраматычны серыял «Два бакі адной Ганны» (Украіна).
**11.40** «Еўрафэст. Дзень за днём».
**12.10** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**13.05** Камедыйны дэтэктыўны серыял «Монк» (ЗША).
**14.05** Шпілька.
**14.30** Камедыйны серыял «Офіс» (ЗША).
**15.15, 19.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Швецкі стол з модным меню... у Гётэборгу».
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Капкан» (Расія).
**17.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Беларусь - Канада. Прамая трансляцыя.
**19.55** Лёдавае шоў Я.Плюшчанкі «Залаты лёд Страдзівары».
**21.00** Панарама.
**21.50** Фантастычны серыял «Зорны крэйсер «Галактыка» (ЗША - Вялікабрытанія).
**23.40** Рамантычная музычная камедыя «Толькі не ў вясны» (Францыя).
**01.45** Дзень спорту.

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.05** Прэм'ера. «Шальны анёл». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.05** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Хачу ведаць».
**15.10** «Гарачы лёд». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Агонь кахання». Шматсерыйны фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Дакументальны дэтэктыў».
**19.00** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Клуб вясёлых і знаходлівых». Вышэйшая ліга.
**23.15** Трылер «Трынаццаты паверх».
**01.00** «Наша Belarussia».
**01.30** Нашы навіны.
**01.45-01.55** Навіны спорту.

---

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Мiншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Смерць шпіёнам - 2». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Дарагая перадача».
**10.55** «Танга ўтрох». Тэленавэла.
**11.45** «Сіла прыцягнення». Серыял.
**12.40** «Званая вячэра».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Добры дзень, доктар!».
**14.20** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.10** Фільм «Даун Хаўс». Расія, 2000 г.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Асабісты інтарэс».
**17.20** «Мiншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Сіла прыцягнення». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** КВЗ. Першая ліга. 1/8 Фіналу.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.25** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.05** Фільм «Поле бітвы - Зямля». ЗША, 2000 г.

---

**06.55** «ЛАДная раніца».
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Дэтэктыўны серыял «Тэрмінова ў нумар!» (Расія).
**09.10** У гэты дзень.
**09.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.10** Час футболу.
**10.40** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.30** «Лабірынты: хаджэнні Варсанофія».
**12.00** Кінараман «Вяртанне Будулая» (СССР). 4-я серыя, заключная.
**13.15** Вострасюжэтная меладрама «Жанчына жадае ведаць» (Расія). 1-я серыя.
**14.10** Прэм'ера. Мультсерыял «Галактычны футбол» (Францыя). 1-я і 2-я серыі.
**15.00** Пазакласная гадзіна.
**15.10** Школа рамонту.
**16.05** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.05** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дэтэктыўны серыял «Тэрмінова ў нумар!» (Расія).
**19.55** Беларуская часіна.
**20.55** Калыханка.
**21.15** Экспедыцыя.
**21.20** Фантастычная камедыя «Унутраная прастора» (ЗША).
**23.35** Хакей. НХЛ. Агляд тыдня.

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** Тэлесерыял «Кармеліта».
**10.10** Тэлесерыял «Калі яе зусім не чакаеш».
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Трое супраць усіх».
**12.20** Фільм «Дзеці як дзеці». 1978 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Кулагін і партнёры».
**14.55** «Ту -104. Апошнія словы лётчыка Кузняцова». Дакументальны фільм.
**15.50** «Бітва за звышгук». Дакументальны фільм.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Гарадок». Дайджэст.
**17.55** Тэлесерыял «Лэдзі Мэр», 2001 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** «Дзяжурны па краіне».
**20.30** Фільм «Агітбрыгада «Бі ворага!». 2007 г.
**23.00** Навіны - Беларусь.
**23.10** Дэтэктыў «Круг асуджаных». 1991 г.
**01.00** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**09.00** «Галоўны герой».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Рускія не здаюцца!».
**10.50** Шнур вакол свету.
**11.20** Дэтэктыўны серыял «Залатыя хлопцы».
**12.10** Драматычны серыял «Палюбоўнiца».
**13.00** Сёння.
**13.35** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**15.05** Проста цырк.
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Працяг будзе».
**18.15** «Ты не паверыш! Ньюс».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.40** «Следства вялі...».
**20.45** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**21.05** Суперстар прадстаўляе: «Крутыя 90-я. Шчаслівыя песні смутнага часу».
**23.05** Авантурны трылер «Спрытныя рукі».

### EUROSPORT

**09.30** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Аргентыны».
**10.00** Формула-1.
**10.30** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 6-ы дзень.
**12.00** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 7-ы дзень. Прамая трансляцыя.
**15.00** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 6-ы дзень.
**16.30** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 7-ы дзень. Прамая трансляцыя.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.15** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 7-ы дзень. Прамая трансляцыя.
**19.45** Футзала. Кубак УЕФА. 1/2 фіналу. «Кайрат» (Казахстан) - «Інтэрв'ю» (Іспанія).
**21.00** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 7-ы дзень. Прамая трансляцыя.
**00.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**00.15** Экстрэмальны спорт. Моладзевая зона.
**00.30** Футзала. Кубак УЕФА. 1/2 фіналу. «ВІЗ-Сінара» (Расія) - «Дынама» (Масква, Расія).
**01.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**02.00** Армрэстлінг. PAL/NAL.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Аб'ектыў.
**22.55** Серыял «Кансультацыя ў ружовым садзе».
**19.00** Хто ёсць кім?: Лера Сом.
**19.15** «Чарнобыльцы». Польшча, 2001 г.
**19.40** Праект «Будучыня».
**21.15** Рэпартаж «Без рэтушы»: «Салідарныя з Беларуссю». Польшча, 2009 г.
**20.25** Кружэлка.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Госць «Белсату».
**21.35** Маст. фільм «Смерць як луста хлеба». Польшча, 1994 г.
**23.30** Серыял «На поўных абаротах».
**00.00** Аб'ектыў.

## 25 КРАСАВІКА, СУБОТА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.30** Відэафільм АТН «Гарвард: гамарня кадраў».
**09.05** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.15** Сямейная камедыя «Мішу з Абэра» (Францыя).
**11.25** Відэафільм «Людзі на балоце» цыклу «Асяроддзе пасялення».
**12.10** Меладрама «Добры дзень Вам!» (Украіна).
**14.05** «Будні чэмпіёнаў».
**14.30** «У чаканні Мундыяля». Дзённік чэмпіянату свету па футболе-2010.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.10** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**16.35** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**17.35** Відэафільм АТН «Паэмы Нясвіжскага кахання» цыклу «Зямля беларуская».
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.30** Авантурная камедыя «Агенцтва «Мара» (Расія - Украіна).
**21.00** Панарама.
**21.45** Гісторыка-рамантычная драма «Мемуары гейшы» (ЗША).
**00.25** Уласнай персонай.
**00.55** Чэмпіянат свету па аўтагонках «Формула-1». Гран-пры Бахрэйна. Кваліфікацыя.

---

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.35** «Здароўе».
**10.20** «Смак».
**11.00** Прэм'ера. «Мікалай Гогаль. Таямніца смерці».
**12.00** Фільм «Сцюарт Літл».
**13.25** Тэлечасопіс «Саюз».
**13.55** «Кінаметры вайны». «Вялікае вандраванне кінематаграфістаў».
**14.25** «Маленькі сяржант». Мастацкі фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Вялікая палітыка.
**16.50** Прэм'ера. Эдвард Радзінскі. «Напалеон. Жыццё і смерць». Фільм 4-ы.
**17.50** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**18.45** Прэм'ера. «Леднiковы перыяд: Глабальнае пацяпленне». Фінал.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Леднiковы перыяд: Глабальнае пацяпленне». Працяг.
**22.35** «Пражэктарпэрысхілтан».
**23.15-01.45** Драма «Каханне падчас халеры».

---

**06.15** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.05** «Гарачы лёд».
**08.30** Фільм «Прыгоды Электроніка». СССР, 1980 г. 3 -я серыя.
**09.35** «Я - вандроўца».
**10.00** «Крокі да поспеху».
**10.55** «Мінск і мінчане».
**11.30** «Каханне Маё». Камедыйны серыял.
**12.30** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.00** Фільм «Семнаццаць імгненняў вясны». СССР, 1973 г. 7-я і 8-я серыі.
**15.30** «Ваенная таямніца».
**16.20** «Наша справа».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** Фільм «Гульня ў джын». Расія, 2000 г.
**18.05** «Top Gear. Руская версія».
**19.00** «Малая Радзіма».
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.05** Фільм «Небяспечны Бангкок». ЗША, 2008 г.
**21.50** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** Фільм «Клубнічка ў супермаркеце». Германія-Італія-Югаславія, 2003 г.
**00.25** СТБ прадстаўляе: «Сімфанічныя сустрэчы з Прэзідэнцкім аркестрам». Музыка Венесуэлы і Кубы.
**01.20** Фільм «Спакуслівыя - 2». ЗША, 2001 г.

---

**06.55** «ЛАДная раніца».
**08.00** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Дэтэктыўны серыял «Тэрмінова ў нумар!» (Расія).
**09.10** У гэты дзень.
**09.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.05** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.00** Моладзевая камедыя «Нечаканы паварот» (ЗША).
**12.30** Вострасюжэтная меладрама «Жанчына жадае ведаць» (Расія). 2-я серыя.
**13.20** Мультсерыял «Галактычны футбол» (Францыя). 3-я серыя.
**13.45** Пазакласная гадзіна.
**14.00** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**14.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**15.25** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**16.25** Усё аб бяспецы.
**16.55** Навіны культуры.
**17.10** Хакей. Чэмпіянат свету. ЗША - Латвія. Прамая трансляцыя.
**19.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Манчэстэр Юнайтэд - Тотэнхем. Прамая трансляцыя.
**21.25** «Грандыёзная гонка». Забаўляльная праграма (ЗША).
**22.30** Камедыйная меладрама «Анатомія Грэй-4» (ЗША).
**00.05** Казанова.

### РОССИЯ

**07.00** Весткі.
**07.10** Шматсерыйны фільм «Міхайла Ламаносаў». «У гонар Айчыны». 1986 г.
**10.00** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.15** Фільм «Гамлет Шчыгроўскага ўезду». 1975 г.
**12.50** «Павел I». Дакументальны фільм.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Гарадок».
**14.30** Фільм «Плашчаніца Аляксандра Неўскага». 1992 г.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Прэм'ера. «Аншлаг і Кампанія».
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі ў суботу.
**19.40** Прэм'ера. «Гарадок».
**20.40** Прэм'ера. «З днём нараджэння, Ала!». Юбілейны канцэрт Алы Пугачовай.
**23.40** Фільм «Ало, Варшава!». 1971 г.
**01.10** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**07.35** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Казкі Бажэнава».
**08.45** Мультфільм.
**08.55** «Агляд».
**09.25** «Без рэцэпту».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.30** «Асоба небяспечны!».
**14.05** Прыгодніцкі фільм «Кевін з Поўначы».
**16.00** Сёння.
**16.30** «Жаночы погляд».
**17.05** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак. Аддзел аператыўных расследаванняў».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум». Скандалы. Інтрыгі. Расследаванні.
**21.10** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**22.10** «Ты не паверыш!».
**23.05** Прэм'ера. Камедыйны фільм «Перамотка».
**00.50** Містычны трылер «Дом начных зданяў».

### EUROSPORT

**09.30** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Аргентыны». 1-ы дзень.
**10.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**10.15** Футзала. Кубак УЕФА. 1/2 фіналу. «Кайрат» (Казахстан) - «Інтэрв'ю» (Іспанія).
**11.30** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Аргентыны». 1-ы дзень.
**12.00** Формула-1.
**12.30** Аўтагонкі. Суперкубак Паршэ ў Бахрэйне. 1-я гонка.
**13.15** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 8-ы дзень. Прамая трансляцыя.
**15.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**15.15** Футзала. Кубак УЕФА. 1/2 фіналу. «ВІЗ-Сінара» (Расія) - «Дынама» (Масква, Расія).
**16.30** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 8-ы дзень. Прамая трансляцыя.
**19.30** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 8-ы дзень.
**21.00** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 8-ы дзень. Прамая трансляцыя.
**00.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Турнір «World Max» (Японія).
**01.30** Формула-1.
**02.00** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 8-ы дзень.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Аб'ектыў.
**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода».
**18.40** Дак. фільм «Смех і молат». Данія, 2005 г.
**20.10** На колах.
**20.35** YoLife!
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.10** Блізкая гісторыя. Дак. фільм «Парангены». Польшча, 2005 г.
**21.45** Маст. фільм «Вакол свету за восемдзесят дзён». ЗША–Югаславія, 1989 г.
**23.20** Еўропа сёння.
**23.45** Дак. фільм «Жылі-былі... ». Беларусь, 2007 г.
**00.00** Аб'ектыў.

## 26 КРАСАВІКА, НЯДЗЕЛЯ

**1**

**06.50** Моладзевы серыял «Сэрца акіяну» (Францыя).
**07.20** Прыгодніцкі серыял «У пошуках капітана Гранта» (СССР).
**08.25** Альманах вандраванняў.
**08.55, 14.50** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.00** Навіны.
**09.05** Арсенал.
**09.35** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**10.00** Культурныя людзі.
**10.35** Усе стыхіі.
**11.10** У свеце матораў.
**11.45** «Еўрафэст. Дзень за днём».
**12.00** Навіны.
**12.10** Сацыяльная драма «Я памятаю...» (Беларусь).
**13.55** Nota Bene.
**14.25** Навіны.
**14.35** Навіны рэгіёна.
**14.55** Чэмпіянат свету па аўтагонках «Формула-1». Гран-пры Бахрэйна. Гонка. Прамая трансляцыя.
**16.55** Лёдавае шоў Я.Плюшчанкі «Залаты лёд Страдзівары».
**17.55** Суперлато.
**18.55** «Зорныя танцы».
**20.35** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** «Панарама тыдня».
**22.10** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**22.45** Рамантычная камедыя «Экс-палюбоўнік» (ЗША).
**00.15** Камедыйны серыял «30 РОК» (ЗША).

**ОНТ**

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.50** «Шалапутныя нататкі».
**10.10** Пакуль усе дома.
**11.00** Фазэнда.
**11.35** «Разумніцы і разумнікі».
**12.20** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**13.05** «Зваротны адлік».
**13.35** Нядзельны «Ералаш».
**14.00** Прэм'ера. «Эдуард Хіль. Сто хітоў караля эстрады».
**15.00** Прэм'ера. «Уладзіслаў Дваржэцкі. Непрыкаяны».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Меладрама «Аўрора». Украіна, 2006 год.
**18.25** Прэм'ера АНТ: «Песні маёй краіны».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**21.40** Фільм «Слухаючы цішыню».
**23.30** «Што? Дзе? Калі?». Фінал.
**00.45-01.20** «Камедзі Клаб».

**СТВ**

**06.55** «Праверана на сабе».
**07.40** «Вовачка - 4». Камедыйны серыял.
**08.05** Фільм «4:0 на карысць Танечкі». СССР, 1982 г.
**09.30** «Добры дзень, доктар!».
**10.00** Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.55** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Каханне Маё». Камедыйны серыял.
**12.30** «Аўтапанарама».
**13.00** Фільм «Скарб». Украіна, 2007 г.
**14.40** «Дарагая перадача».
**15.00** «Культурнае жыццё».
**15.30** «Прыватныя гісторыі».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** Уваскрэсенне класікі. Дыялогі аб музыцы.
**18.00** «Фантастычныя гісторыі».
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.30** Фільм «Я памятаю...». Беларусь, 2006 г.
**22.05** «Спартыўны тыдзень».
**22.25** «Прафесійны бокс».
**23.20** «Агенцтва «Залатая куля». Серыял.

**ЛАД**

**08.20** Дабравест.
**08.50** Бухта капітанаў.
**09.30** Наша пяцёрачка.
**10.00** Мультфільм.
**10.15** Фантастычны серыял «Прыгоды Электроніка» (СССР). Заключная серыя.
**11.25** Медычныя таямніцы.
**12.05** Сезон поспеху.
**12.45** Пасоўванне+.
**13.00** Гаспадар.
**13.30** «Чарнобыльскія джунглі». Відэафільм («Белвідэацэнтр»).
**13.55** Дэтэктыўны серыял «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана». Фільм «ХХ стагоддзе пачынаецца» (СССР). 1-я серыя.
**15.30** Камедыйны серыял «Дурнушка Бэці» (ЗША).
**17.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Славакія - Беларусь. Прамая трансляцыя.
**19.30** Экспедыцыя.
**20.00** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Дынама (Мінск) - БАТЭ. Прамая трансляцыя.
**22.00** Тэлебарометр.
**22.20** Свая музыка.
**22.50** Пасоўванне +.
**23.20** «Правы чалавека».
**23.35** Хакей. Чэмпіянат свету. Расія - Францыя.

**РОССИЯ**

**07.00** «Здабытак рэспублікі».
**07.25** Шматсерыйны фільм «Міхайла Ламаносаў». «У славу Айчыны». 1986 г.
**08.45** Драма «Асяцінская легенда». 1965 г.
**10.05** «Смехапанарама» Яўгенія Петрасяна.
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.00** Дэтэктыў «Вяртанне Турэцкага». Фільм 5 «Ён абяцаў вярнуцца».
**14.00** Весткі.
**14.20** Прэм'ера. «Па той бок жыцця і смерці. Пекла». Дакументальны фільм.
**15.25** Прэм'ера. «Танцы з Зоркамі». Сезон-2009.
**18.25** «Сумленны дэтэктыў».
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** «Спецыяльны карэспандэнт».
**20.35** Прэм'ера. Фільм «Цячэ рака Волга». 2009 г.
**22.30** Камедыя «Рэцэпт вядзьмаркі». 2003 г.
**00.25** Заканчэнне эфіру.

**НТВ**

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.15** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.25** Выратавальнікі.
**10.55** «Прафесія-рэпарцёр».
**11.25** «Авіятары».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Крамлёўскія пахаванні».
**14.05** Фантастычныя прыгоды «Падземелле цмокаў».
**16.00** Сёння.
**16.30** «Барацьба за ўласнасць».
**17.05** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак. Злачынны намер».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**19.50** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.30** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**21.05** «Галоўны герой».
**22.20** «Рускія не здаюцца!».
**22.55** Прэм'ера. Крымінальная драма «Шультэс».
**00.45** «Футбольная ноч».

**EUROSPORT**

**09.30** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Аргентыны». 2-і дзень.
**10.00** Супербайк. Чэмпіянат свету ў Нідэрландах. Суперпоул.
**10.30** Марафон. Лондан. Прамая трансляцыя.
**13.45** Супербайк. Чэмпіянат свету ў Нідэрландах. 1-я спроба.
**14.15** Супербайк. Чэмпіянат свету ў Нідэрландах. Прамая трансляцыя.
**15.00** Веласпорт. Льеж-Бастонь-Льеж.
**18.00** Футзала. Кубак УЕФА. Фінал.
**19.30** Супербайк. Чэмпіянат свету ў Нідэрландах. 2-я спроба.
**20.15** Мотаспорт па выхадных.
**20.45** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 9-ы дзень. Прамая трансляцыя.
**00.00** Бокс.
**02.00** Мотаспорт па выхадных.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**18.00** Прэс-экспрэс.
**18.15** Серыял «Ранча».
**19.05** Форум.
**19.55** «Без рэтушы»: дак. фільм «Белы ветразь над Прыпяццю». Беларусь, 2008 г.
**21.00** Аб'ектыў.
**21.20** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Дзяржавы».
**21.25** Жаўтуха.
**21.55** Фільматэка майстроў: маст. фільм «Метад». Іспанія–Францыя, 2005 г.
**00.00** Аб'ектыў.

# ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску на 2009 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

### Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

Министерство связи и информатизации
Республики Беларусь
№ ____________ (по реестру ф. 11)
№ ____________ (по реестру ф. 10)

ИСПРАВЛЕНИЯ НЕ ДОПУСКАЮТСЯ

ПРИЕМ

Предоплата за доставку г-ты "Новы час"

| Наименование предприятия связи, к - гербовая печать | Календарный шт. места подачи | № по ф. 5 | Сумма, вид услуги, подпись оператора |
|---|---|---|---|

ПОЧТОВЫЙ ПЕРЕВОД на ____________________ руб.

____________________ (сумма прописью)

Кому Куда Г-та "Новы час", р/с 3012211080010 фил. МГДОАО "Белинвестбанк", код 153001764, УНН 190790926 г. Минск, ул. Коллекторная,11

От кого ____________________

Адрес ____________________ (почтовый индекс и подробный адрес)

### Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у адзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

ИЗВЕЩЕНИЕ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
____________________ (фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|

Период подписки указывает абонент
Плательщик
Пеня ______
Всего ______
Кассир

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
____________________ (фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|

Период подписки указывает абонент
Плательщик
Пеня ______
Всего ______
Кассир

ЦІКАВА

# СЕПАРАТЫСТЫ, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Іван БІЧ

**Напрыканцы сакавіка ў Барселоне прайшоў кангрэс Еўрапейскага вольнага альянсу (EFA), прысвечаны будучым выбарам у Еўрапарламент. Галоўны лозунг сходу — надаць кожнаму еўрапейскаму этнасу права на дзяржаўнасць.**



Асноўную прамову трымала Нэлі Маэс, старшыня EFA. Яна была бескампраміснай. Нэлі паскардзілася на тое, што «з часу правядзення кангрэсу ў 2004 годзе ў Еўропе паўстала толькі дзве незалежныя дзяржавы — Косава і Македонія».

«Мы перакананыя, што ў хуткім часе ўзнікне яшчэ больш новых дзяржаў — аўтарытэтных акцёраў у еўрапейскай палітыцы. Напрыклад, Каталонія», — аптымістычна закончыла старшыня альянсу.

Падобныя заявы можна было б лічыць прыколам, калі б не той факт, што EFA дастаткова ўплывовая структура. Яна мае дэпутацкую групу ў Еўрапарламенце. Партыі — сябры EFA фармуюць і ўваходзяць у рэгіянальныя ўрады (Шатландыя, Каталонія).

Еўрапейскі вольны альянс уяўляе сабой кангламерат партый, што адстойваюць правы народаў краін ЕС, якія не маюць дзяржаўнасці.

Гісторыя гэтага незвычайнага Інтэрнацыяналу пачалася, калі адбыліся першыя выбары ў Еўрапарламент. У выніку дэпутацкія мандаты атрымалі прадстаўнікі пяці рэгіянальных партый — Сацыял-дэмакратычнай лейбарысцкай партыі (Паўночная Ірландыя), Фламандскага народнага саюза (VU), Дэмакратычнага фронту Валоніі (Бельгія), Народнай партыі Паўднёвага Цыролю (Італія), Шатландскай нацыянальнай партыі (SNP).

Шатландцы і паўночныя ірландцы далучыліся адпаведна да фракцый лібералаў і сацыял-дэмакратаў. Затое валонцы і фламандцы паспрабавалі стварыць Тэхнічную групу прыхільнікаў незалежнасці. У 1981 годзе некалькі еўрапейскіх рэгіянальных партый дамовіліся сфармаваць адзіны картэль — той самы Еўрапейскі вольны альянс. З тых часоў у Еўрапарламенце стала існуе фракцыя EFA.

Аднак на той момант саюз доўга не пратрымаўся. Перш за ўсё ў кожным рэгіёне той ці іншай краіны ЕС існавала свая мадэль нацыяналістычнага руху. Так, у Каталоніі нацыяналісты гістарычна былі звязаныя з левым рухам, а ў Паўночнай Італіі — з правым.

У 1989 годзе частка рэгіяналаў, уключаючы сяброў EFA, паспрабавала сфармаваць групу правых рэгіяналаў. Яна называлася «Група вясёлкі» і складалася з прадстаўнікоў Краіны Баскаў, Паўночнай Італіі, Корсікі. Да іх таксама далучылася група Дацкага народнага руху еўраскептыкаў. Адначасова партыя Канвергенцыя — Саюз за Каталонію выйшла з EFA, але не ўступіла ў «Групу вясёлкі».

Раскол працягваўся і пасля выбараў 1994 года. Правыя ўвайшлі ў фракцыі кансерватараў і лібералаў. Іншыя (SNP, VU і Канарская кааліцыя) стварылі сваю групу Еўрапейскі радыкальны альянс. Пытанне, якім мае быць рух еўрапейскіх рэгіёнаў, засталося адкрытым.

Па выніках выбараў 1999 года перамогу, прынамсі часовую, у гэтым канфлікце здабылі левыя. Дэпутаты ад партый, якія ўваходзяць у EFA, заснавалі разам з Зялёнымі супольную фракцыю Greens/European Free Alliance. У фракцыі EFA на той час было 10 чалавек (уэльсцы, шатландцы, фламандцы, баскі, андалузцы і галісійцы). Тым не менш гэта не перашкодзіла EFA абвесціць сябе ў 2000 годзе Еўрапейскай партыяй.

Зрэшты, гэты крок быў абсалютна лагічны. Партыі — сябры EFA прадстаўлены практычна ў кожнай краіне Еўрасаюза. Якіх толькі экзатычных назваў тут не сустрэнеш: Партыя Маравіі (Чэхія), Партыя Аквітаніі (Францыя), Славенскі саюз і Рух за незалежнасць Сіцыліі (Італія), Партыя польскага народу (Літва), Рух за аўтаномію Сілезіі (Польшча), Партыя Фрызаў (Германія).

Усяго Еўрапейскі вольны альянс аб'ядноўвае 40 партый з 20 краін ЕС. Цікава, што партыі прадстаўляюць не краіну, а рэгіёны. Думаецца, што калі б сёння ў Беларусі, як напачатку 90-х, актывізаваўся палескі рух, ён даўно б атрымаў сяброўства ў EFA.

Апошнія праграмныя дакументы EFA былі прынятыя ў 2000 годзе. Адпаведна ім, Еўрапейскі вольны альянс выступае за «Еўропу вольных народаў, якая грунтуецца на прынцыпах кааперацыі і салідарнасці паміж еўрапейскімі нацыямі і ўсімі народамі свету». Гэта значыць, што ЕС мусіць адмовіцца ад цэнтралізацыі, абараняць культурную і моўную спецыфіку рэгіёнаў.

Структура альянсу вельмі дэмакратычная. У генеральнай асамблеі кожная партыя мае адзін голас. Вышэйшы орган EFA — Савет. Старшыня альянсу — Нэлі Маэс. Яна нарадзілася ў 1941 годзе, па адукацыі педагог. У 1971 годзе была абраная ў парламент Бельгіі ад фламандскай партыі «Народны саюз», стала сенатарам, таксама дэпутатам фламандскага і еўрапейскага парламентаў. З 2001 года — старшыня Еўрапейскага вольнага альянсу.

Нягледзячы на левы трэнд, некаторыя партыі — сябры Еўрапейскага вольнага альянсу было б больш правільна аднесці да партый правага цэнтру (Партыя бельгійцаў, якія размаўляюць па-нямецку, Баварская партыя, Венецыянская рэспубліканская партыя). Аднак тыя групоўкі малаўплывовыя. Асаблівы статус у EFA мае латышская Партыя за правы чалавека, якая абараняе правы рускамоўных грамадзян. Па сваіх прынцыпах гэта левая партыя, аднак шмат хто крытыкуе яе за тое, што яна часам бывае падтрымлівае прарасійскія фашысцкія групоўкі, кшталту РНЕ або нацыял-бальшавікоў.

Дададзім, што існуе досыць сур'ёзная канкурэнцыя з правага боку. Правыя рэгіяналы прадстаўлены такімі моцнымі і ўплывовымі партыямі, як згаданая вышэй Паўночная Ліга, Фламандскі блок (Бельгія), Баскская нацыянальная партыя, Канвергенцыя — Саюз за Каталонію (Іспанія). Ёсць у правым лагеры таксама і карлікавыя арыгінальныя партыі кшталту Партыі франкафонаў Балгарыі. Асобна трэба згадаць легендарную партыю Шын Фейн (Вялікабрытанія — Ірландыя), якая падтрымлівае фракцыю Еўрапейскіх левых.

Самае незразумелае ў палітыцы і праграмных дакументах Еўрапейскага вольнага альянсу — тое, якім чынам яго лідэры збіраюцца трансфармаваць ЕС у канфедэрацыю народаў. Тым больш, маючы галоўнымі саюзнікамі Зялёных, якія патрабуюць перадачы ўсіх функцый нацыянальных урадаў Еўрапейскім структурам. Яшчэ больш не зразумела, як гэта зрабіць у час цяперашняга эканамічнага крызісу.

Нагадаем, што крызіс у Ісландыі справакаваў шалёнае падзенне аўтарытэту нацыяналістаў у той жа Шатландыі. Людзі баяцца, што без апекі Лондану і Бруселя ім зараз эканамічна не выжыць.

Пра тое, што заклікі EFA трэба разумець асцярожна, сведчыць і пазіцыя Еўрапейскага вольнага альянсу па пытанню незалежнасці Паўднёвай Асеціі і Абхазіі. Кіраўнікі EFA дэкларацыі Сухумі і Цхінвалі аб незалежнасці ігнаравалі. Замест гэтага ў жніўні 2008 года прынялі рэзалюцыю з патрабаваннем да Афінаў прызнаць права македонцаў называцца македонцамі.

Увогуле, рэзалюцыі EFA — асобная песня. Такую экзотыку яшчэ трэба пашукаць. Напрыклад, у снежні мінулага года Еўрапейскі вольны альянс праявіў салідарнасць з жыхарамі італьянскага Паўднёвага Цыролю, якія пратэставалі супраць продажу календароў на 2009 год з выявай Мусаліні (дучэ ў свой час праводзіў палітыку асіміляцыі нямецкамоўных жыхароў краю). А ў лютым гэтага года альянс прыняў заяву ў падтрымку двух хлопцаў з Нанту, якія малявалі графіці за стварэнне адзінага дэпартаменту Брэтань.

Як можна зразумець, для EFA больш важная канкрэтная падтрымка руху ў абарону рэгіянальнай і культурнай ідэнтычнасці на месцах. Гэта таксама вельмі істотна. Жарты жартамі, а тым хлопцам з Нанту за нацыяналістычныя надпісы на сценах улады выпісалі штраф у 30 тысяч еўра.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Здаецца, што не столькі Расія кантралюе рэжымы Какойты, Смірнова, Лукашэнкі і іншых, колькі яны намагаюцца кантраляваць Расію, патрабуючы ў яе новыя прывілеі ў абмен на абяцанкі палымянай лаяльнасці. У гэтай сітуацыі старая думка наконт «нашага сукіна сыну» набывае незвычайную афарбоўку. З тым, што сукін сын — сябра, таварыш і брат, ніхто не спрачаецца. Застаецца ўдакладніць па-сямейнаму: старэйшы або малодшы.

**«Коммерсант-ъ» (Расія)**

Нашы адносіны з Беларуссю заходзяць у тупік. Адзіным плюсам можна лічыць, магчыма, толькі вайсковае супрацоўніцтва. Аднак наколькі гэта важна на фоне рэзкага пахаладання? 1 красавіка з кабельных сетак Беларусі зніклі аж пяць расійскіх каналаў. А мы ўсё кажам: «Украіна, Украіна»... Шматлікія апазіцыянеры з патрыятычнага лагеру ва ўсім вінавацяць Крэмль. Быццам гэта крамлёўскія Бацьку адштурхнулі. Логікі тут асаблівай няма. Па-першае, што значыць «адштурхнулі»? Беларусь, як і раней, карыстаецца прэферэнцыямі. Адсюль салідны грант у эквіваленце 12 працэнтаў ВУП Беларусі. Па-другое, калі невялікай краіне так моцна патрэбныя крэдыты, то наўрад ці можна размаўляць пра рэальную незалежнасць. Інакш нашто ў такой сітуацыі дэманстраваць такі гонар? Сёння мы назіраем поўны правал знешнепалітычнай палітыкі Аляксандра Лукашэнкі. Цяпер можна ўпэўнена меркаваць, што адмовіўшыся стаць часткай Расіі, Беларусь будзе часткай Захаду. Паказальна, што рэспубліка ўцягнутая ў арбіту міжнародных фінансавых структур, а гэта смяротны прысуд. Варта ўзгадаць лёс румынскага лідэра Чаўшэску, які таксама спрабаваў балансаваць паміж СССР і Захадам. Гэты палітык набраў шмат даўгоў і паспрабаваў разлічыцца коштам жорсткай эканоміі. Вынік вядомы — рэвалюцыя і трыбунал.

**«Русский обозреватель» (Расія)**

Між іншым, прызнанне Беларуссю незалежнасці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі, здаецца, зацягваецца на нявызначаны тэрмін. Робячы разлік на дапамогу ЕС і міжнародных фінансавых арганізацый, прэзідэнт Беларусі наўрад ці будзе дражніць Захад да заканчэння глабальнага крызісу, а што будзе пасля, прагназаваць цяжка. Маскве ў такой сітуацыі застаецца толькі прыняць рэальнасць, абараняць сваю пазіцыю ў адзіноце і не сварыцца з адным з галоўных транспарцёраў расійскіх вуглеродаў у Еўропу.

**«Республика» (Паўднёвая Асеція)**

Ніякага рэальнага аднаўлення мяжы паміж Расіяй і Беларуссю чакаць не трэба. Гэта хутчэй палітычнае, чым сапраўднае. Словы лідэра рэспублікі наўрад ці будуць мець сур'ёзныя наступствы, аднак у чарговы раз нагадваюць Расіі пра існаванне межаў. Згадка пра мяжу была неабходнай пасля нядаўняга рашэння Расіі адмовіць Беларусі ў выдачы крэдыту.

**«Речь» (Расія)**

Не магу сабе ўявіць, што ў Польскай Народнай Рэспубліцы пасля 13 снежня 1981 года (увядзенне вайсковага становішча) быў бы магчымы, напрыклад, з'езд «Салідарнасці». Яго б папросту не дапусцілі. У гэтым кантэксце нельга казаць пра рэжым Лукашэнкі як «таталітарны», бо гэта не адпавядае рэчаіснасці. Прэзідэнт Беларусі даў сінгал, што любыя перамовы магчымыя. Шкада толькі, што польская дыпламатыя не скарысталася шансам аб'яднаць два варожыя Саюзы палякаў. Лукашэнка не прымае рашэнні ў стане эмоцый. У сітуацыі фінансавага крызісу ён павінен захоўваць добрыя адносіны з усімі партнёрамі. Доўгі час балансуе паміж ЕС і Расіяй.

**«Tribuna» (Польшча)**

Такія крокі (патрабаванне новых крэдытаў) ёсць праява слабасці эканамічнай палітыкі цяперашняй улады. Аднаўленая ў Беларусі савецкая мадэль гаспадаркі не здольная вырабляць канкурэнтны на знешніх рынках тавар у такім аб'ёме, каб ён выраўняў гандлёвы баланс. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка, як і раней, адмоўна ставіцца да рынкавых рэформаў, напрыклад, прыватызацыі. У выніку гандлёвы баланс краіны нельга выраўняць за кошт продажу інвестарам уласнасці. А гэта, у сваю чаргу, гаворыць пра тое, што перспектыва крэдытаў, якія набрала Беларусь, вельмі не зразумелая.

**«Независимая газета» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ФРАНЦЫЯ. ЛЕВЫЯ ТЭРАРЫСТЫ ВЫРАТАВАЛІ СВЕТ АД АТАМНАГА ЖАХУ



Левая грамадскасць Германіі пачала кампанію ў абарону двух баевікоў нямецкай левай радыкальнай групоўкі Рэвалюцыйныя ячэйкі (RZ), якія хаваліся ў Францыі. На днях парыжскі суд вырашыў выдаць абодвух — жанчыну і мужчыну, якім ужо пад 70 гадоў, — нямецкай паліцыі. Абаронцы тэрарыстаў кажуць, што іх нельга караць, паколькі... яны выратавалі свет ад атамнай вайны.

RZ узніклі ў другой палове 70-х, калі ўвесь свет шакавалі падзеі ў Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы, дзе паліцыя адкрыла агонь па мірных дэманстрантах і забіла 176 чалавек, Радыкальныя левыя ў Германіі вырашылі ў адказ падкладаць бомбы пад офісы нямецкіх кампаній і фірм, якія супрацоўнічалі з урадам Паўднёвай Афрыкі. У тым ліку яны актыўна падпальвалі склады і прадстаўніцтвы кампаній, якія дапамагалі рэжыму Прэторыі зрабіць сваю ўласную атамную бомбу. Расісты сапраўды марылі пра сваю ядзерную зброю, якая магла б стаць моцным аргументам у барацьбе супраць краін-суседзяў, што падтрымлівалі рух чарнаскурых у Паўднёвай Афрыцы. Аднак у выніку стварыць бомбу не паспелі. Адным словам, свету моцна пашанцавала, і левыя выданні кажуць, што ў гэтым ёсць істотны ўнёсак баявікоў RZ.

**Па матэрыялах «Tageszeitung» (Германія)**

### ТАЙВАНЬ. ЗАРЭГІСТРАВАНАЯ КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ



Камуністычная партыя Тайваню атрымала афіцыйнае пасведчанне аб рэгістрацыі за подпісам дырэктара МУС. Дзейнасць камуністаў была забароненая на востраве яшчэ з часоў Чан Кайшы. Мясцовыя прыхільнікі ідэй Маркса і Леніна неаднаразова спрабавалі легалізавацца, аднак беспаспяхова. Акрамя апошняга разу. Хаця не абышлося без кур'ёзаў. У 2000 годзе прэзідэнт Чэнь Шуйбянь, які пачаў дыялог з КНР, заявіў, што камуністы могуць дзейнічаць легальна. Тыя хуценька сабраліся, аднак міністр унутраных спраў адмовіўся выдаць патрэбны дакумент аб рэгістрацыі іх партыі. Камуністы ў адказ пайшлі па судовых інстанцыях. І ў выніку перамаглі: у мінулым годзе Вышэйшы суд даў згоду на легальную дзейнасць камуністаў. МУС было вымушана падпарадкавацца. Цікава, што камуністы Тайваню ўпарта кажуць, нібыта яны не маюць ніякіх кантактаў з камуністычным Пекінам.

**Па матэрыялах «Lewica» (Польшча)**

### ШВЕЙЦАРЫЯ. СУСВЕТНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ СУПРАЦЬ РАСІЗМУ І ЗА АНТЫСЕМІТЫЗМ

На 20–24 красавіка ў Жэневе прызначаная другая сусветная канферэнцыя супраць расізму. Напярэдадні арганізатары робяць усё магчымае, каб пазбегнуць скандалу. Яны памятаюць вынікі першай канферэнцыі, якая адбылася ў верасні 2001 года ў Дурбане (Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка). Падчас таго з'езду былі прынятыя яўна антысеміцкія рэзалюцыі. Дэлегаты нават адмаўлялі факт Халакосту. У выніку прадстаўнікі Ізраілю пакінулі канферэнцыю. Іронія гісторыі — праз два дні пасля заканчэння мерапрыемства Аль-Каіда атакавала ЗША. Новая канферэнцыя абяцае быць яшчэ больш скандальнай. Палкоўнік Кадафі, які будзе прадстаўляць Лівію, ужо заявіў, што стане дамагацца прызнання ісламу універсальнай рэлігіяй чалавецтва. Баючыся новага выбуху антысемітызму, афіцыйны Парыж ужо заклікаў да байкоту сустрэчы. Між тым, арганізатары кажуць, што антысеміцкія забабонаў не дапусцяць. Яны, напрыклад, дабіліся таго, што з тэкстаў праектаў рэзалюцыі выключана слова «габрэй».

**Па матэрыялах «Charle hebdo» (Францыя)**

ПАРТЫІ

# АД МУСАЛІНІ ДА БЕРЛУСКОНІ

**Алег НОВІКАЎ**



**У Італіі самараспусцілася партыя Нацыянальны альянс (AN) — гістарычны нашчадак Саюза фашыстаў Беніта Мусаліні. Былыя сябры AN дружна вырашылі ўступіць у партыю кансерватараў.**

Журналісты, якія пісалі рэпартажы з апошняга з'езду партыі Нацыянальны альянс, канстатуюць: дэлегаты не дэманстравалі ніякага пачуцця настальгіі або разгубленасці.

Нагадаем, што рашэнне пра самароспуск Нацыянальнага альянсу было, на першы погляд, прынята пад прымусам і дыктатам цяперашняга прэм'ера Сільвія Берлусконі. Кавалер (мянушка палітыка) — галоўны спонсар і харызматычны лідэр італьянскай правай — заявіў, што не бачыць сэнсу ў будучым фармаваць шырокія выбарчыя кааліцыі. Зараз ён будзе ісці на выбары самастойнай партыяй — Popolo della Liberta (Народ свабоды).

«Хто не са мной, той супраць мяне», — фактычна даў зразумець Сільвія сваім саюзнікам па ўраду: партыі Нацыянальны альянс і Лізе Поўначы. Пагроза заслугоўвае ўвагі. Берлусконі кантралюе амаль увесь медыярынак. Альянс не вытрымаў маральнага ціску і пагадзіўся на харакіры. Яго сябры ўвайшлі ў новы партыйны праект Берлусконі.

Для кожнага фанатыка мадэлі правага аўтарытарызму навіна пра роспуск AN гучыць як пахавальны звон па ўсёй традыцыі. Нацыянальны альянс — прамы гістарычны нашчадак Саюзу фашыстаў Беніта Мусаліні. Саюз быў забаронены пасля краху фашысцкага рэжыму, аднак пасля вайны ў 1947 годзе былыя фашысты змаглі сабрацца пад дахам новай партыі — Італьянскага сацыяльнага руху (MSI).

Ужо абрэвіятура партыі казала пра погляды яе заснавальнікаў. MSI — гэта скарочаная форма прозвішча Мусаліні. З тых часоў MSI стаў сапраўдным жупелам, крыніцай пагрозы асновам італьянскай рэспублікі. Місіні (так празвалі сяброў MSI) адкрыта сімпатызавалі рэжыму Франка, казалі, што дыктатура «чорных палкоўнікаў» у Грэцыі — прыклад для Італіі. На базе радыкальнага крыла MSI існаваў шэраг тэрарыстычных арганізацый, адказных за так званую «стратэгію напругі» — арганізацыю тэрарыстычных атак. Некаторыя сябры руху нават спрабавалі ўзняць паўстанне супраць рэспублікі.

Праўда, шмат хто бачыў у праекце MSI руку ЦРУ, якое баялася прыходу да ўлады папулярных на Апенінах камуністаў і актыўна фінансавала любыя антыкамуністычныя арганізацыі. Напрыклад, MSI, нягледзячы на шум вакол фашысцкіх герояў, якія памерлі за радзіму змагаючыся з амерыканцамі, падтрымала ўступленне Італіі ў блок NATO. MSI нават заплюшчыла вочы на тое, што некаторыя артыкулы статуту NATO супярэчылі прынцыпам руху. Напрыклад, Італія як сябра Паўночнаатлантычнага альянсу аўтаматычна адмаўлялася ад знешніх тэрытарыяльных прэтэнзій, прызнавала перадачу шэрагу гарадоў на беразе Адрыятыкі Югаславіі.

Нават пасля 1995 года, калі да кіраўніцтва MSI прыйшоў прагматычны Джанфранка Фіні, які перайменаваў рух у Нацыянальны альянс і нават зрабіў тур у Ізраіль, AN канчаткова не пазбавіўся іміджу партыі карычневых. Колькі Фіні не казаў партыйцам, што Мусаліні — гэта архаіка, тыя ўсё роўна кожны год святкавалі гадавіну Паходу на Рым.

І вось цяпер легендарная арганізацыя добраахвотна распускаецца, каб уліцца ў склад партыі, якая марыць стаць асновай кансерватыўнага лагеру. Больш таго, як паказвае настрой сяброў Нацыянальнага альянсу, яны абсалютна не супраць такога варыянту. «Нарэшце ў нас будзе сапраўдная партыя для італьянцаў», — было напісана на адным транспаранце ў зале, дзе адбываўся пахавальны з'езд AN. Такім чынам, відавочна, што, уступаючы ў партыю Берлусконі, экс-сябры альянсу пераследуюць нейкія стратэгічныя мэты. Якія?

Зараз у Італіі мае месца цікавая палеміка наконт будучага новай партыі. Як стануць будавацца адносіны паміж Фіні і Берлусконі? Хто ўрэшце займее больш пераваг ад гэтага аб'яднання?

Што ў выніку атрымае Берлусконі? 8–9 працэнтаў выбаршчыкаў італьянскага электарату — прыкладна столькі людзей зараз галасуюць за Нацыянальны альянс. Што атрымае Фіні і яго ныя прыхільнікі? Куды больш?

Партыя Берлусконі — партыя са слабым ідэйным рэнаме, якую вызначае выключна асоба яе лідэра. Былыя сябры Нацыянальнага альянсу лепш разумеюць, якое значэнне мае вайна дэфініцый, праца на культурным фронце. Напрыклад, дзякуючы міністрам AN дзяржаўныя чыноўнікі сталі выкарыстоўваць такія правыя паняцці, як «нацыянальная ідэнтычнасць». Левая прэса звярнула ўвагу на словы Берлусконі, якія ён сказаў падчас устаноўчага кангрэсу, што «прыйшоў час кансенсусу». Тэзісам «кансенсус» прыхільнікі фашызму называюць позні я гады дыктатуры Мусаліні, якія папярэднічалі ўступленню Італіі ў вайну ў 1940 годзе. На гэтыя гады прыйшоўся зеніт яго дыктатуры: апазіцыя была знішчана, прэса манапалізавана, людзі не верылі, што можа быць нейкая альтэрнатыва.

Людзі Фіні канчаткова пазбаўляюцца іміджу фашыстаў. Былыя фашысты атрымліваюць пропуск ва ўплывовы еўрапейскі Інтэрнацыянал кансерватыўных партый, так званую Народную партыю.

У любым выпадку, роспуск Нацыянальнага альянсу — гэта не рэакцыя на крызіс іміджу або параза. Ніколі раней столькі правых не было ў прадстаўнічых органах Італіі. На думку шматлікіх экспертаў, Фіні і Берлусконі рухаюць агульныя тактычныя задачы. Апошнія красавіцкія выбары папросту знішчылі левы фланг італьянскай палітыкі. Бастыёны працоўнага руху ўпершыню прагаласавалі за правых. Правыя, адпаведна, намагаюцца хутчэй замацаваць і цэментаваць палітычную і грамадскую гегемонію, «этнапалітызаваць» дыскусію, як сказаў адзін з італьянскіх левых палітыкаў.

Аднак мовы пра фашызм, што прызнаюць самі левыя, тут нават быць не можа.

ГЕАПАЛІТЫКА

# ЗША ПАСЯБРУЮЦЬ З КУБАЙ

**17 красавіка на востраве Трынідад і Табага пачаўся саміт Арганізацыі амерыканскіх дзяржаў. Напярэдадні Барак Абама прыняў сенсацыйнае рашэнне: упершыню за 50 гадоў Штаты паслабілі рэжым эканамічнай ізаляцыі Кубы. Прапануем вашай увазе агляд міжнароднай прэсы з нагоды гістарычнай падзеі.**



### Даведка

**1959 год** — партызаны Кастра ўваходзяць у Гавану. Дыктатар Батыста, якога падтрымлівалі ЗША, бяжыць.
**1960 год** — Фідэль Кастра нацыяналізуе ўласнасць амерыканскіх прадпрымальнікаў пасля таго, як ЗША адмовіліся ад экспарту кубінскіх прадуктаў.
**1961 год** — ЗША дапамагаюць эмігрантам, праціўнікам Кастра, арганізаваць дэсант на Кубе. Аднак аперацыя заканчваецца правалам.
**1962 год** — ЗША ўводзяць забарону гандлю з Кубай.
**1962 год** — Карыбскі крызіс.
**1977 год** — прэзідэнт Джымі Картэр абмяжоўвае правы грамадзян ЗША наведваць Кубу.
**1980 год** — Кастра высылае з краіны 125 тысяч кубінцаў.
**1982 год** — прэзідэнт ЗША Рональд Рэйган робіць працэдуру наведвання Кубы для амерыканцаў яшчэ больш складанай.
**1991 год** — Генеральная Асамблея ААН прыняла рэзалюцыю, якая крытыкуе Вашынгтон за палітыку эмбарга ў адносінах да Кубы.
**2004 год** — Джордж Буш кардынальна ўскладніў правілы візітаў на Кубу і перасылку туды грошай (амерыканец можа наведваць краіну раз на тры гады, заставацца там толькі на працягу 12 дзён, перасылаць родным не больш ста долараў на месяц).
**13 красавіка 2009 года** — Барак Абама дазваляе амерыканцам, якія маюць родзічаў на Кубе, вольна наведваць востраў, перасылаць грошы. Таксама прапануе план стварэння спецыяльнага спадарожніка, праз які кубінцы змогуць размаўляць са сваімі родзічамі ў Злучаных Штатах праз мабільныя тэлефоны. Па словах Дэна Рэстрэпа, сябра Савета нацыянальнай бяспекі ЗША, «прэзідэнт абяцаў зрабіць крокі, якія пашыраць ступень свабоды на Кубе, і ён гэта зрабіў». Адпаведна апытанням, 70 працэнтаў амерыканцаў выступаюць за нармалізацыю адносін.

Эмбарга яшчэ цалкам не адмянілі, аднак «*Los Angeles Times*» (ЗША) ужо палічыла, колькі Куба можа зарабляць на турызме. Па падліках журналістаў, востраў будзе здольны штогод прымаць каля 3 мільёнаў турыстаў. Акрамя таго, 1,5 мільёна грамадзян ЗША маюць родзічаў на Кубе, што таксама важны фактар для развіцця турыстычнай інфраструктуры і інвестыцый. Па дадзеных выдання, рашэнне Абамы выклікала ажыўленне ў турыстычных кампаніях. Так, *Travel Services* запускае ў ліпені спецыяльны рэйс з Лос-Анжэлеса ў Гавану.

Іспанская «*La Vanguardia*» ўпэўненая, што палітыка адкрытасці Злучаных Штатаў накіравана на тое, каб прарваць плаціну ізаляцыі хаця б у адным месцы. У такім выпадку рухне ўся канструкцыя. Грошы, якія амерыканскія родзічы дасылаюць сваякам, цяпер можна будзе атрымліваць працэй. Пашырэнне гэтай практыкі ставіць Гавану ў эканамічную залежнасць ад паўночнага суседа: ужо цяпер пераводы з ЗША — трэцяя крыніца даходаў кубінскай гаспадаркі.

Ужо згаданая «*L.A. Times*» прысвячае асобны артыкул такому чынніку пераменаў на востраве, як тэлекамунікацыі. Калі Куба дазволіць амерыканцам кубінскага паходжання дасылаць сваім родным мабільнікі і камунікаваць з імі, гэта пашырыць светапогляд людзей, зменіць іх ментальнасць, каштоўнасці. На цяперашні момант сектар тэлекамунікацыі вельмі абмежаваны. Толькі 11 працэнтаў кубінцаў маюць дома тэлефоны. Толькі два працэнта грамадзян Кубы карыстаюцца мабільнымі тэлефонамі.

З «*L.A. Times*» згодная нямецкая «*Tageszeitung*»: «За кошт развіцця тэлекамунікацый і павялічэння колькасці візітаў амерыканцаў на Кубу, Абама імкнецца стварыць прамы кантакт паміж людзьмі на Кубе і ЗША».

«*Washington Post*» лічыць, што амерыканцы фактычна ўжо зараз пачалі падрыхтоўку для змены рэжыму. Рауль Кастра — вельмі стары чалавек, і яго сыход з палітычнай сцэны чакаецца ў бліжэйшыя гады. Пры ўмове стварэння адпаведнай грамадскай атмасферы, яго сыход можа даць старт рэформам. Варта адзначыць, што падчас сваёй выбарчай кампаніі Абама не казаў пра тое, што ў выпадку перамогі абавязкова знішчыць рэжым Кастра. Ён сцвярджае, што задача на гэты час — «паменшыць залежнасць кубінцаў ад Кастра».

Перадавы артыкул іспанскай «*El Pais*» аддае належнае амерыканскай дыпламатыі. Рашэнне пра перагляд рэжыму эмбарга было прынята напярэдадні адкрыцця саміту Арганізацыі амерыканскіх дзяржаў на востраве Трынідад і Табага. Пасля рэформаў Абамы Куба апынулася ў стане даўжніка, прычым таксама ў вачах усёй Амерыкі. Яна павінна неяк рэагаваць.

А вось лонданская «*Times*» дастаткова крытычна ставіцца да ініцыятыў новай адміністрацыі ЗША, паколькі яны не тычацца такой важнай праблемы, як правы чалавека. Выданне заклікае не ставіць эканоміку на першы план за кошт пытання грамадзянскіх правоў.

Французская «*Le Monde*» лічыць, што галоўная праблема Абамы зараз не Куба, а ідэйны разрыў паміж Поўначчу і Поўднем Амерыкі — прадукт палітыкі Джорджа Буша. Апошнія гады мы былі сведкамі параду перамог у Лацінскай Амерыцы левых палітыкаў. Рыторыка апошніх таксама будавалася на нянавісці да грынга. «Для Абамы зараз галоўнае, — адзначае выданне, — аднавіць дыялог і пачаць кааперацыю са сваімі амерыканскімі суседзямі. Прэамбула да такой праграмы — закончыць канфлікт з Кубай, які расцягнуўся на паўстагоддзя».

Цікавая рэакцыя рэспубліканскага лагеру на заявы Абамы. Рычард Лугар, вядомы рэспубліканец, прызнаў, што рэжым эмбарга сябе вычарпаў, аднак у той жа час, на яго думку, кубінская палітыка Абамы няправільная, паколькі дазволіць за кошт грашовых пераводаў з-за мяжы палепшыць фінансавую сітуацыю.

Застаецца згадаць рэакцыю афіцыйнай Гаваны. Дзяржаўнае тэлебачанне Кубы вельмі аператыўна агучыла навіну з Вашынгтону (гэта здзівіла шмат каго). Фідэль Кастра ў сваёй калонцы на старонках газеты «Гранма» напісаў, што «Куба як чыніла супраціў, так і будзе яго чыніць».

Прадстаўнік кубінскай апазіцыі сацыял-дэмакрат Мануэль Куэста заявіў, што ініцыятыва Абамы «не зможа растапіць лёд паміж двума ўрадамі». На яго думку, эмбарга дапамагае кубінцам лепш зразумець жудасную рэальнасць, у якой яны жывуць па волі камуністаў.

**Падрыхтаваў Алег Новікаў**

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### ЛЕАНІД ГРАЧ

Лідэра крымскіх камуністаў выключылі з кіраўніцтва Кампартыі Украіны (КПУ) за крытыку амаральнага ладу жыцця генсека КПУ Пятра Сіманенкі, што збег ад жонкі да каханкі, якая нарадзіла ад яго дзіця. Грач стаў на бок былой жонкі, якая мае ад першага шлюбу дваіх дзяцей, і ў выніку апынуўся ў апазіцыі. Большасць прэзідыуму КПУ прагаласавала за тое, каб выкінуць Грача з кіраўніцтва за антыпартыйную дзейнасць. Цяпер Грач жорстка адпомсціў Сіманенку за тую знявагу. Узяў і сфармаваў свой уласны блок, з якім пойдзе на наступныя выбары ў Вярхоўную раду (выбары чакаюцца ўвосень). З грашыма ў Леаніда таксама праблем не будзе. Яго падтрымаў Васіль Волга — алігарх, адзін з былых лідэраў Сацыялістычнай партыі, цяперашні лідэр Саюзу левых сіл. Падчас першай канферэнцыі Грач нечакана заявіў, што за ягоны блок будуць галасаваць людзі, для якіх Аляксандр Пушкін — святое імя. Другая забаўка: Грач лічыць, што КПУ падтрымае ягоную кааліцыю з Волгам. Між тым, відавочна, што ў выпадку выбараў Грач адбярэ ў КПУ значную частку электарату, асабліва на поўдні Украіны.



### ХАСЭ ЛУІС САПАТЭРА

Прэм'ер-міністр іспанскага ўраду адмовіўся выконваць абяцанне, якое 30 гадоў таму даў першы дэмакратычны іспанскі ўрад. Тагачасны, першы пасля дыктатуры Франка, прэм'ер Суарэс заключыў кампраміс з баскскімі нацыяналістамі, якія патрабавалі ўключыць у склад аўтаноміі Краіны баскаў правінцыю Навара (Навара лічыцца калыскай дзяржаўнасці баскаў). Суарэс паабяцаў, што праз 30 гадоў жыхары Навары будуць мець права прыняць рашэнне на рэферэндуме — жадаюць яны быць у складзе Краіны баскаў або не. 30 гадоў прайшло, аднак ніякага ўсенароднага галасавання ў Навары не адбылося. Не дзіўна, што баскскія нацыяналісты выйшлі на вуліцы, пратэстуючы супраць падману ўраду. Акрамя таго, яны пратэставалі супраць новага ўраду аўтаноміі Краіны баскаў, сябрамі якога ўпершыню ў гісторыі аўтаноміі сталі секцыі іспанскіх партый — сацыялісты і кансерватары. Падчас пратэстаў было прынята рашэнне напрыканцы мая правесці забастоўку. Як ні парадаксальна гучыць, шмат хто лічыць, што парыў працоўных зможа прыпыніць Аранца Кігора — сябра Народнай партыі і адна з міністраў новага ўраду аўтаноміі. Яна — культавая фігура ў вачах усіх феміністак краю. Хаця з улікам таго, што Аранца не размаўляе па-баскску, нумар можа не спрацаваць.

### УГА ЧАВЕС

Прэзідэнт Венесуэлы прыдумаў, як рэабілітавацца за паразу на муніцыпальных выбарах у сталіцы ў мінулым лістападзе. Нагадаем, што на іх тады перамагла апазіцыя на чале з Антоніа Ледзема. Апошні стаў мэрам Каракаса. Падазраючы, што Ледзезма збіраецца выкарыстаць пасаду для арганізацыі антыўрадавых пратэстаў, Чавес контратакуе.

Дэпутаты нацыянальнага парламенту, абсалютную большасць якога складаюць прыхільнікі рэжыму (апазіцыя падчас апошніх парламенцкіх выбараў абвясціла байкот), прапанавалі папраўкі ў закон аб мясцовым самакіраванні. Дасюль Каракас меў той жа статус, што і кожная з 22 правінцый. Адпаведна новаму праекту, кіраўнік будзе абірацца парламентам правінцыі. Апазіцыя ўжо заявіла, што збіраецца пратэставаць супраць папраўак у закон. Цікава, што супраць праекту галасавалі нават дэпутаты некаторых партый, якія раней падтрымлівалі рэжым Чавеса.



ЭКСКЛЮЗІЎНАЕ ІНТЭРВ'Ю

# Уладзімір Дунаеў: «ЕГУ — ГЭТА УНІКАЛЬНЫ ВЫПАДАК У ГІСТОРЫІ ВЫГНАННЯ»

**Гісторыя суверэннай Беларусі адзначана не толькі палітычнымі баталіямі, але і неаднаразовымі рэарганізацыямі сістэмы адукацыі, якія, як лічаць шматлікія навукоўцы і эксперты, толькі уніфікавалі вучэбныя ўстановы, а гэта ніяк не можа спрыяць вяртанню Беларусі ў Еўропу. Пра наступствы такога стаўлення ўладаў да адукацыі ў гутарцы з аглядальнікам Раманам Якаўлеўскім разважае доктар філасофскіх навук Уладзімір Дунаеў.**



Бібліятэка Тартускага універсітэта



Варшаўскі універсітэт

***— Да гэтага часу нямала гаварылася пра Еўрапейскі гуманітарны універсітэт у выгнанні. Разам з тым чамусьці ніколі не згадвалася, ці гэта з'ява унікальна або ўжо ў гісторыі ёсць падобныя прэцэдэнты і вучэбныя ўстановы такога кшталту існуюць. Што ж гэта такое — універсітэт у выгнанні?***

— Выгнанне — гэта толькі адна з мер, якія выкарыстоўваюць улады для пакарання універсітэтаў. Дакладней, універсітэцкай супольнасці, студэнтаў і выкладчыкаў. Першапачаткова слова «universitas» азначала любую карпарацыю або арганізаваную супольнасць людзей з агульнымі інтарэсамі і незалежным прававым статутам. Таму універсітэты — гэта, найперш, самакіравальныя акадэмічныя супольнасці. Менавіта гэтыя супольнасці і становяцца ахвярай рэпрэсій. На працягу стагоддзяў універсітэты зачынялі, перамяшчалі, дарылі і, безумоўна, выганялі.

Выгнанне ў XX стагоддзі стала масавай палітычнай практыкай. Настолькі прыкметнай з'явай сучаснага жыцця, што паўстала нават «тэорыя выгнання». Яе аўтар — выбітны палесцінскі мысляр-выгнаннік Эдвард Саід. Ён вызначыў выгнанне як гвалтоўнае і незваротнае адсячэнне ад родных мясцінаў.

Універсітэты адпраўляюцца ў выгнанне не па сваёй волі. Гэта зразумела. Але незваротнасць выгнання, на першы погляд, выглядае вельмі песімістычным прагнозам. Але Саід мае рацыю — вярнуцца ў кропку сыходу вельмі цяжка, папросту немагчыма. Нават калі універсітэт здолее вярнуцца на радзіму з выгнання, то гэта будзе цалкам новы універсітэт — і таму, што па-за домам ён павінен змяніцца, каб выжыць, і таму, што на радзіме яму давядзецца зноў шукаць сваё месца. Сярод гісторый універсітэтаў, якія называлі сябе выгнаннікамі, даволі мала такіх, якія маюць шчаслівы канец.

Еўрапейскі гуманітарны універсітэт — гэта сапраўдны універсітэт у выгнанні. Пасля закрыцця ў Беларусі па палітычных матывах ЕГУ атрымалася аднавіць — а практычна стварыць наноў — у Літве. Важную ролю ў гэтым адыграла пазіцыя універсітэцкай супольнасці, якая падтрымала такі рызыкоўны крок, і, вядома, беспрэцэдэнтная міжнародная дапамога, якая дазволіла ЕГУ выжыць і атрымаць легальны статут літоўскага універсітэта. Гэта унікальны выпадак у гісторыі выгнання. Аналагаў гэтаму досведу мала. Але і самі гэтыя гісторыі ўстаноў-выгнаннікаў разнастайныя. Сярод універсітэтаў, якія дадавалі да сваёй назвы азначэнне «ў выгнанні», нам варта адрозніваць перамешчаныя і эвакуяваныя універсітэты, універсітэты для выгнаннікаў і ўласна універсітэты ў выгнанні. У іх розны лёс, і пакуль цяжка сказаць, што чакае ЕГУ.

***— Што такое перамешчаны універсітэт?***

— У гісторыі Усходняй Еўропы гэтая вельмі характэрная з'ява. Можна ўзгадаць два універсітэта, якія сімвалізавалі крах русіфікатарскай палітыкі ў гэтым рэгіёне: Варшаўскі і Юр'еўскі універсітэты. Юр'еў — гэты руская назва эстонскага горада Тарту, у якім з XVII стагоддзя існаваў спачатку шведскі, а потым — нямецкамоўны універсітэт. Аднак у 1892 годзе адбылася гвалтоўная русіфікацыя універсітэта. З-за моцнага процідзеяння такой палітыцы з боку эстонскага насельніцтва і нямецкай інтэрвенцыі ў 1918 годзе Юр'еўскі універсітэт быў перамешчаны ў Варонеж. Праз год у Тарту быў створаны нацыянальны эстонскі універсітэт. Але трэба сказаць, што руская прафесура загадзя паклапацілася пра месца новага прытулку для Юр'еўскага універсітэта і спрабавала пераканаць урад Расійскай імперыі, Часовы і Савецкі ўрад у неабходнасці пераводу яго ў Расію. Гэта было вельмі цяжка зрабіць, таму што ўлады не хацелі адмаўляцца ад такога фарпоста імперскай палітыкі ў Эстоніі. Выгнаны з Эстоніі, Юр'еўскі універсітэт здолеў знайсці прытулак у Варонежы дзякуючы таму, што не ўрад, а мясцовыя супольнасці гарадоў-кандыдатаў выяўлялі вялікую зацікаўленасць і жаданне фінансава забяспечыць перамяшчэнне універсітэта.

Вельмі падобная гісторыя адбылася з Варшаўскім (Аляксандраўскім) універсітэтам. Універсітэт некалькі разоў зачыняўся з-за непрыхаванага супрацьстаяння палякаў рускай імперскай палітыцы. З 1862 года універсітэт быў пераведзены на рускую мову выкладання і мусіў забяспечваць рускія інтарэсы ў Польшчы. Але супраціў быў настолькі моцным, што з 1902 года універсітэт практычна не мог працаваць. Універсітэцкая карпарацыя з 1906 года настойвала на перамяшчэнні ВНУ на Усход. Сярод гарадоў-кандыдатаў былі і беларускія — Мінск і Віцебск. Але да 1915 года, калі універсітэт давялося тэрмінова эвакуяваць у Растоў-на-Доне, улады супраціўляліся такім планам. І, як у гісторыі з Юр'еўскім універсітэтам, пераезд у Растоў-на-Доне стаў магчымым дзякуючы пазіцыі мясцовай улады і грамадзянскім ініцыятывам. Праўда, Варшаве пашанцавала больш, чым Тарту. У адрозненне ад Юр'еўскага універсітэта, які паспеў вывезці значную частку бібліятэкі, калекцый і лабараторнага абсталявання, паспешлівыя ўцёкі з Варшавы перашкодзілі рускім прыхапіць універсітэцкую маёмасць.

***— Можна сказаць, што такое выгнанне — гэтае вяртанне дадому. Гэта, хутчэй, павучальны досвед таго, як універсітэцкая ініцыятыва і грамадская падтрымка дазваляюць ВНУ знайсці сваё месца на радзіме.***

— Так, але гэта і ўрок таго, як цяжка, нават і пры велізарнай палітычнай і фінансавай падтрымцы, укараніць універсітэт у чужым нацыянальна-культурным асяроддзі. Нават калі гэта асяроддзе не такое варожае, як у згаданых прыкладах з Юр'еўскім і Варшаўскім універсітэтамі. Вымушаныя пакінуць радзіму з-за акупацыі, грамадзянскай вайны, іншых аналагічных пагроз, універсітэты пры першай магчымасці імкнуцца вярнуцца назад. Так, гэта адбылося з Кабульскім універсітэтам, што стаў ахвярай вайны і тэрору талібаў, або са Страсбургскім універсітэтам, які пераехаў на некалькі гадоў з акупаванага немцамі Эльзаса ў Клермон-Феран на поўдні Францыі. І калі выгнанне зацягваецца без дастатковых падстаў, гэта можа справакаваць пратэсты акадэмічнай супольнасці, як адбылося, напрыклад, ва універсітэце Джуба (Судан). Гэты універсітэт вымушаны быў пакінуць поўдзень Судану з-за грамадзянскай вайны і ўладкавацца ў Хартуме. Там дайшло да сутыкненняў студэнтаў з паліцыяй.

***— Але ж ёсць універсітэты, якія ствараюцца адмыслова для выгнаннікаў. У іх, напэўна, іншы лёс?***

— Гэта сапраўды так. Калі вы ўводзіце ключавыя словы «універсітэт у выгнанні» ў пошукавую сістэму кшталту *Google*, то, хутчэй за ўсё, вы атрымаеце спасылку на Новую школу сацыяльных даследаванняў у Нью-Йорку. У 1933 годзе пры гэтай школе быў створаны універсітэт у выгнанні — праграма падтрымкі нямецкіх навукоўцаў — ахвяр нацызму. Дзякуючы гэтай праграме за гады другой сусветнай вайны больш 170 інтэлектуалаў і іх сем'і знайшлі прытулак у ЗША. Пазней да іх далучыліся французы. Сярод тых, хто выратаваўся дзякуючы Новай школе сацыяльных даследаванняў, — Хана Арэнд, Лео Штраўс, Клод Леві-Строс, Раман Якабсон і шмат іншых. І пасля вайны гэтая школа працягвае цікавіцца Усходняй і Цэнтральнай Еўропай, але універсітэтам у выгнанні яна больш не з'яўляецца. Гэта нармальны амерыканскі універсітэт.

У перыяд «халоднай вайны» студэнты, што ўцякалі з краін усходняга блока, маглі знайсці прытулак, напрыклад, ва універсітэце ў выгнанні Вольная Еўропа (*Free Europe University in Exile*). Зрэшты, гэты амерыканскі праект не быў сапраўдным універсітэтам, бо не здолеў даць сваім выпускнікам дыплом, які б прызнаваўся.

Універсітэты ў выгнанні, асуджаныя на доўгае знаходжанне

### Біяграфічная даведка



Уладзімір ДУНАЕЎ. Нарадзіўся 25 кастрычніка 1948 года ў Мінску. Скончыў аддзяленне філасофіі, аспірантуру БДУ, дактарантуру Інстытута філасофіі (Масква). Доктар філасофіі, прафесар. 1983–1991 — навуковы супрацоўнік, загадчык аддзелу Сацыялагічнага цэнтра БДУ. 1992–2008 — сузаснавальнік, прарэктар Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта.

Сябра выдавецкай калегіі часопіса «Перакрыжаванні» (Вільнюс, Літва), старшыня рэгіянальнага савета «Сацыяльныя трансфармацыі ў памежжы: Беларусь, Украіна, Малдова».

Галоўнае поле даследаванняў: сацыялогія і менеджмент вышэйшай адукацыі, гісторыя філасофіі (Еўропа і ЗША), палітычная філасофія.

ўдалечыні ад радзімы, звычайна губляюць сваё значэнне і занепадаюць. Павучальны прыклад Польскага універсітэта ў выгнанні (*PUNO*), які быў створаны ў 1939 годзе ў Парыжы, а пасля акупацыі Францыі перабраўся ў Лондан. Ён існуе і зараз, алеператварыўся ў сціплы каледж для навучання дарослых і польскі культурны цэнтр. У 1998 годзе польскі ўрад прызнаў дыпломы, якія выдаваліся *PUNO* да 1990 года — г. зн. да перадачы паўнамоцтваў польскага ўрада ў выгнанні законнаму дэмакратычнаму ўраду. Пасля падзення камуністычнага рэжыму *PUNO* не змог знайсці сваё месца ў сістэме вышэйшай адукацыі Польшчы.

Кароткім было жыццё Балтыйскага універсітэта ў выгнанні. Створаны ў 1946 годзе ў Гамбургу для выкладчыкаў і студэнтаў — уцекачоў з краін Балтыі, што акупаваў СССР, гэты універсітэт зачыніўся ў 1949 годзе, бо так і не атрымаў афіцыйны універсітэцкі статус і прызнанне дыпломаў. Выкладчыкі і студэнты з краін Балтыі даволі хутка знайшлі сабе месца ў іншых універсітэтах Еўропы і ЗША, пасля чаго праект страціў сэнс.

Гэтыя універсітэты для выгнаннікаў, як правіла, не прэтэндуюць на самастойную ролю ў нацыянальнай сістэме адукацыі тых краін, з якіх яны сышлі. Іх досвед не дае адказу на галоўнае пытанне — як універсітэту ў выгнанні знайсці дарогу дадому, дый ці варта яе шукаць?

***— Вось у гэтай сувязі сённа можна пачуць, што ЕГУ ў Вільні мае перспектыву стаць міжнародным універсітэтам. Пры гэтым спасылаюцца на прыклад Цэнтральнаеўрапейскага універсітэта ў Будапешце. Вы можаце ўнесці пэўную яснасць у гэту сітуацыю?***

— Баюся, што я не валодаю дастатковай інфармацыяй для таго, каб казаць пра новую стратэгію ЕГУ. Мы казалі пра тое, што вяртанне з выгнання — гэта вельмі складаная задача. Пакуль у Беларусі для гэтага яшчэ няма перадумоў. Ёсць настойлівыя рэкамендацыі Еўрапарламента, адрасаваныя беларускім уладам, пра пажаданасць вяртання ЕГУ на радзіму. Але міністр адукацыі Радзькоў не бачыць месца ЕГУ на радзіме. У гэтых умовах стратэгія адмовы ад беларускай ідэнтычнасці ЕГУ дзеля перспектывы ператварэння ў міжнародны універсітэт падаецца камусьці добрым крокам. Цэнтральнаеўрапейскі універсітэт — прыклад, варты пераймання. ЦЕУ — гэта міжнародны інстытут для падрыхтоўкі магістраў і дактароў навук, акрэдытаваны адначасова ў ЗША і Венгрыі. Ён прымае студэнтаў з 96 краін, выкладчыкаў — з 30. У яго унікальная фінансавая сітуацыя і выдатная матэрыяльная база. Студэнты атрымліваюць сур'ёзную фінансавую падтрымку — бясплатнае навучанне, стыпендыі і г. д. Напэўна, ЕГУ мог бы з часам ператварыцца ў аналагічны універсітэт, але для гэтага трэба знайсці такога ж донара, якім з'яўляецца Джордж Сорас для ЦЕУ. Без гэтага ў аналагічнага праекта ЕГУ ці наўрад ёсць будучыня.

***— Але калі захоўваць беларускую ідэнтычнасць універсітэта, то чым такі універсітэт мог бы быць карысны нацыянальнай культуры, пакуль ён знаходзіцца ў выгнанні? Ці ёсць хоць нейкі пазітыўны сэнс у выгнання?***

— Выгнанне можа быць пакутлівай незаменнай стратай, а можа ператварыцца ў прадуктыўную рухаючую сілу культуры, пра што пісаў Эдвард Саід. Універсітэт у выгнанні можа аказаць вялікую паслугу нацыянальнай культуры, калі дасць штуршок працэсу яе самааналізу. Выгнаннік валодае той перавагай, што ведае як мінімум дзве культуры, жыццё прымушае яго разумець як мінімум дзве раўналежныя культурныя прасторы і ўвесь час выходзіць па-за традыцыйныя межы мыслення. Саід, сам выбітны музыкант, называў свядомасць выгнанніка контрапунктычнай.

Універсітэт-выгнаннік можа дапамагчы значнаму колу людзей пераадолець як этнацэнтрызм, так і нігілізм у стаўленні да нацыянальнай культуры, дасць магчымасць паглядзець з боку на сваё роднае дзеля таго, каб адчуць сябе часткай адроджанай нацыі. Добра, калі б такая місія не пакінула абыякавай акадэмічную супольнасць ЕГУ.

КАШТОЎНАСЦІ

# КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА УНІЯЦКАЙ ЦАРКВЫ Ў БЕЛАРУРУСІ

Святлана МАРОЗАВА

**Заканчэнне. Пачатак у №№ 12 (140), 13 (141).**



## Выгнанне беларускай мовы

Выганялася з царквы і яе галоўная каштоўнасць — беларуская мова, якая замянялася на рускую. У 1830 годзе ў час рэвізіі Беларускай і Літоўскай епархій звярталася асаблівая ўвага на веданне мовы шараговым духавенствам. І хоць царскім загадам 16 снежня 1839 года прыходскім праваслаўным святарам Беларусі і Украіны прадпісвалася, каб яны «па магчымасці чыталі ў цэрквах у нядзельныя і святочныя дні казані простай агульназразумелай мовай», яе дапушчэнне ў набажэнства не з'яўлялася самамэтай, а была заклікана пераконваць былых уніятаў, што праваслаўе — вера іх продкаў, і служба там адбываецца зразумелая, на роднай мове.

Паслабленне беларускай мове, зробленае ў 1839 годзе, цяжка стасуецца з загадам Сямашкі ад 1840 года забяспечыць святароў Літоўскай епархіі ўзорнымі казанямі на рускай мове, каб яны былі ў стане «ў сваіх павучаннях на простанародных тамашніх гаворках дапасоўвацца да агульнага духу рускай мовы».

Нягледзячы на адміністрацыйны ціск, у шэрагу праваслаўных цэркваў заходніх паветаў Беларусі таемнасці хрышчэння, вянчання, пахавальны абрад выконваліся паводле уніяцкага звычаю, дзецям даваліся традыцыйныя імёны, а тайныя уніяцкія прыходы падтрымлівалі і зберагалі беларускую мову. Яшчэ ў канцы 1880-х гадоў традыцыяў уніі трымалася большасць насельніцтва Гродна і яго ваколіцаў, у дамах прыхаджан захоўваліся уніяцкія абразы і адзначаліся свае святы (напрыклад, св. Ясафата), паводле уніяцкага звычаю хрысцілі дзяцей.

## Духоўная літаратура

Богаслужэбныя кнігі беларускіх уніятаў — сёння вялікая рэдкасць. Абсалютная большасць загінула яшчэ ў 30–50-я гады XIX стагоддзя ад рук тых, хто ўсталёўваў грэка-рускае праваслаўе. Паход супраць уніяцкай кнігі — «крыніцы іншавер'я ды іншадумства» — пачаўся яшчэ ў канцы XVIII стагоддзя.

Імператарскім указам 1787 года дазвалялася друкаваць і прадаваць малітоўнікі і іншыя царкоўныя кнігі толькі духоўным друкарням, падкантрольным Сіноду. У сувязі з узятым у 1794 годзе Кацярынай II курсам на скасаванне уніі, паўстала пытанне пра друкарскую дзейнасць пачаеўскіх базыльян.

Пачаеўскія выданні распаўсюджваліся і чыталіся на Беларусі, пра што сведчаць спісы бібліятэк тутэйшых базыльянскіх кляштараў. Друкарням тады было дазволена выдаваць кнігі на ўзор тых, што друкуюцца ў Кіева-Пячорскай лаўры, з дадаткам, дзе трэба, сімвалу веры «по униатскому их умствованию», месяцаслова з імёнамі шанаваных уніяцкай царквой святых і з імем Папы рымскага.

У XIX стагоддзі святарам забаранялі купляць для прыходскіх цэркваў кнігі пачаеўскага друку.

## Кніжныя аўтадафэ

Указам Сенату 1826 года быў абмежаваны продаж усіх уніяцкіх службоўнікаў. У 1828 годзе ўсе выдавецтвы падпарадкоўваліся духоўнай цэнзуры. Пастановай грэка-уніяцкай калегіі ад 7 лютага 1834 года ўсіх святароў абавязалі карыстацца толькі службоўнікамі і кнігамі малітоўных спеваў, надрукаванымі ў маскоўскай сінадальнай друкарні. Каля трох тысяч такіх выданняў было загадана адправіць у Беларусь па памяркоўнаму кошту.

Але адны святары вярталі прысланыя кнігі назад, іншыя, пакінуўшы іх, у набажэнстве не выкарыстоўвалі. З месяцаў пачалі паступаць масавыя пратэсты супраць увядзення новых службоўнікаў. Знайшоўшы ў іх адрозненні ад сваіх, дрысенскае і себежскае духавенства прасіла пазбаўлення «ад безумоўнага прыняцця і дaслоўнага карыстання» імі.

У 1838 годзе 111 святароў Беларускай епархіі звярнуліся з прашэннем да цара пра захаванне уніі і ўладкаванне друкарняў для выдання уніяцкіх набажэнскіх кнігаў. Яны прапаноўвалі самі выдаткаваць грошы на гэтыя патрэбы. Але на неслухаў абрынуліся рэпрэсіі. Адных паддавалі эпітым'і. Клірыкаў, не згодных прыняць новыя службоўнікі, пераводзілі ў дзякі і нават служкі. Паліцыі было даручана сачыць, каб святары прытрымліваліся новых кніжак і ад іх не адступалі.

У 1834 годзе ва ўсе парафіі Літоўскай епархіі паступіў загад — адабраць з цэркваў старыя уніяцкія службоўнікі ды іншыя кнігі пачаеўскага, віленскага і супрасльскага друку і выслаць іх у Літоўскую духоўную кансісторыю. Толькі старым святарам, не здольным асвоіць новыя псалтыры ды малітоўнікі, і тым, хто, прыкрываючыся гэтым, не хацеў «граць пад маскоўскую музыку», часова былі пакінутыя старыя кнігі.

У 1836 годзе полацкі архібіскуп Лужынскі распарадзіўся адабраць ад святароў сваёй Беларускай епархіі уніяцкую духоўную літаратуру. Але ў час чарговай рэвізіі ён не знайшоў ні ў адной з наведаных шаснаццаці цэркваў пасланых туды маскоўскіх службоўнікаў і пераканаўся, што ўсе святары так і не развіталіся са старымі кнігадрукамі.

Святар Пршэброўскай царквы хаваў новую кнігу ў кладоўцы. Сененскі благачынны Кяткоўскі, атрымаўшы маскоўскі службоўнік, у прысутнасці людзей кідаў яго на зямлю, гаворачы пры гэтым дзёрзкія словы ў адрас епархіяльнага начальства, якое прымушае па ім служыць. Святар Ліскоўскай царквы Арашкевіч на пытанне, чаму ён карыстаецца забароненай кнігай, а не новай, адказаў: «Сумленне маё мне не дазволіла гэтага». Ён, як і іншыя, што супраціўіліся «найвышэйшай волі», быў аддадзены суду Беларускай кансісторыі.

18 чэрвеня 1839 года Літоўская кансісторыя выдала пастанову пра знішчэ трэбнікаў мінулага друку з ужытку. Іх звозілі ў Жыровічы. Але ўжо ў жніўні ўзнікла праблема — што з імі рабіць? Вырашылі спаліць, пакінуўшы па 1–2 асобнікі кожнага выдання для бібліятэкі Літоўскай епархіяльнай семінарыі. У 30–50-я гады на загады літоўскага біскупа (а потым мітрапаліта) Сямашкі адбылося некалькі аўтадафэ ў Жыровічах і Вільні. За адзін раз была спалена 201 кніга, за 3 гады — больш як дзве тысячы.

## Рэшткі уніяцтва

Уратаваныя ад знішчэння кнігі выкарыстоўваліся ў набажэнстве прыхільным да уніі духавенствам. Святар Крайскай царквы Кіпрыяновіч быў пакараны двухтыднёвай эпітым'яй у манастыры за служэнне па старой кнізе пры наяўнасці новай.

У Лідскім і Ашмянскім паветах у 1852 годзе набажэнства праводзілася па кнігах уніяцкага друку. 30 мая 1852 года Сенат распарадзіўся канчаткова забараніць выкарыстоўваць уніяцкую літаратуру. У 1852–1853 гадах паўтары тысячы яе асобнікаў, тады яшчэ сабраных па цэрквах і манастырах, былі спаленыя.

Тым не менш у час рэвізіі цэркваў Кобрынскага павету ў 1856 годзе было знойдзена 16 уніяцкіх службоўнікаў, па якіх праводзілі набажэнства тамашнія святары. Адзін з іх адмовіўся выдаць кнігу, за што быў выкліканы на эпітым'ю ў Вільню. Нават у 1865 годзе мітрапаліт Іосіф звярнуў увагу Сіноду на выкарыстанне даўно забароненых кнігаў. Яго наступнік Макары працягваў выкараняць рэшткі уніяцтва. Паводле звестак В. Ластоўскага, яшчэ ў 1860-я гады на Беларусі ды Украіне выдаваліся загады пра паленне кнігаў уніяцкага выдання, якія дагэтуль дзе-нідзе захоўваліся на званіцах.

Такім чынам, культурная спадчына уніяцкай царквы ў значнай ступені страчана не натуральным шляхам, а ў выніку мэтанакіраванага знішчэння. За 2–3 дзесяцігоддзі зруйнавана шмат з таго, што было створана ў папярэднія два з паловай стагоддзі. Але зламаць моцную уніяцкую культурна-рэлігійную традыцыю, што працяла ўсе сферы людскога жыцця, было нялёгка. Урад і духоўныя ўлады сустрэліся з вялікімі цяжкасцямі, выкліканымі праявамі нацыянальнага і рэлігійнага патрыятызму. Тыя каштоўнасці, што ўдалося зберагчы, працягвалі жыць, выкарыстоўвацца і шанавацца тайнымі прыхільнікамі уніяцтва.

У 1830–1850-я гады адбылося знішчэнне магутнага пласта беларускай культуры, што, у сваю чаргу, абмежавала даследчыкаў у вывучэнні яе мінулага. Уніяцкія абразы, кнігі, скульптуры ды іншыя рэчы — сёння рэдкія і унікальныя экспанаты ў музеях і бібліятэках рэспублікі. Не менш рэдкая і унікальная з'ява ў нашым жыцці — беларуская мова, названая калісьці К. Гаворскім «униатским наречием». Непапраўныя разбуральныя наступствы для нацыянальнай культуры, якія сталі следствам гвалтоўнага скасавання уніяцкай царквы на Беларусі, на доўгія дзесяцігоддзі вызначылі развіццё нашай краіны.

▸ **АНОНС**

# ПА МУЗЕЯХ І ВЫСТАВАЧНЫХ ЗАЛАХ

Аляксей ХАДЫКА

**Да 200-годдзя з дня нараджэння выдатнага класіка рускай літаратуры Мікалая Гогаля ў Нацыянальным мастацкім музеі адчынілася выстава «Мікалай Гогаль і яго героі ў творчасці мастакоў XX стагоддзя», якая працуе па 4 мая.**







Гогаль у Беларусі быў «прачытаны» сродкамі розных відаў мастацтва яшчэ пры жыцці: трупа В. Драздоўскага ў Мінску ажыццявіла пастаноўкі «Рэвізора» (27 лістапада 1948 года) і «Жаніцьбы» (25 студзеня 1850 года). Год пасля смерці Мікалая Васілевіча «Цяжбу» на віцебскай сцэне ставіла трупа І. Гатавіцкага (1853). Літаратурныя пераклады паўсталі ўжо ў XX стагоддзі — «Выбраныя творы» выйшлі ў пераўвасабленні М. Лужаніна, «Жаніцьба» — К. Крапівы, «Мёртвыя душы» — М. Машары. А дарэвалюцыйная «Наша ніва» змясціла артыкул да 100-годдзя нараджэння Гогаля. Гэтыя публікацыі, разам з расійскімі прыжыццёвымі выданнямі, між іншым, можна ўбачыць зараз на адмысловай экспазіцыі ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Мінску.

Што датычыць Мастацкага музея, то ў паказаных там творах наведвальніку прапануецца прачытанне літаратурных тэкстаў і рэфлексія з нагоды літаратурных вобразаў у суаўтарстве са стваральнікамі вобразаў у выяўленчым мастацтве. Традыцыя іх увасаблення вельмі багатая. Яна пачалася ў ілюстрацыях мастакоў, сучаснікаў пісьменніка, А. Агіна, П. Баклеўскага, П. Сакалова. У Беларусі да тэмы «Тараса Бульбы» ў 1929 годзе звярнуўся адзін з найлепшых жывапісцаў таго часу Міхась Філіповіч, а наш сусветна вядомы зямляк Марк Шагал праілюстраваў «Мёртвыя душы» ў 1923–1925, скарыстаўшы працу для пазнейшага рарытэтнага парыжскага выдання 1948 года.

«Пераклады» Гогаля на мову пластычнага мастацтва ў музеі прадстаўлены 34 работамі беларускіх, рускіх і ўкраінскіх творцаў. І гэта не толькі ілюстрацыі кніжнай графікі — так, Барыс Вараб'ёў, які працаваў на Ленінградскім фарфоравым заводзе, увасобіў герояў камедыі «Рэвізор» і паэмы «Мёртвыя душы» ў пластыцы. Да найбольш вядомых прац-ілюстрацый «Мёртвых душ» савецкай эпохі належаць прадстаўленыя гледачу малюнкі пяром Анатоля Лапцева, якія адзначаюцца выразна адчутай вобразнасць персанажаў і тонка адлюстраваным духам эпохі. Апрача прац, уключаных у юбілейнае выданне паэмы 1957 года, музей прадстаўляе і адзін нявыкарыстаны твор гэтай серыі — «Капітан Капейкін». Да найбольш каштоўных экспанатаў адносіцца партрэт самога Гогаля савецкага графіка Юрыя Магілеўскага з аўтографам апошняга, твор патрапіў у музей праз атрымальніка падарунка, беларускага мастака Уладзіміра Правідохіна. Яшчэ адна цікавостка — аўталітаграфія Эмануіла Бернштэйна з выяваю дома на Вялікай Мяшчанскай у Пецярбургу, дзе ў 1829 годзе Гогаль суседнічаў з Адамам Міцкевічам, — праўда, пазнаёміўся з ім толькі праз шэсць год ужо ў Парыжы.

Яшчэ адна мастацка-літаратурная падзея — першая персанальная выстава жывапісу сучаснага беларускага літаратара і выдаўца Адама Глобуса «Магма», разгорнутая па 20 красавіка ў галерэі «Падземка» (пр. Незалежнасці, 43) і прысвечаная прэзентацыі яго чарговага зборніка Play.by. 7 красавіка заўсёдна іранічны аўтар літаратурных партрэтаў, гісторый і назіранняў з беларускага жыцця «Сучаснікі» прадставіў у «Падземцы» зборнік сваіх публікацый у перыёдыцы, эсэ для сайту «Навіны» і назіранняў за светам расійскай культуры «Расейская кунсткамера», пачынаючы ад таго ж Гогаля да сучаснага паэта Аляксея Паршчыкава. Дэкларавўшы сваё крэда як «сапраўднага анархіста-індывідуаліста», Глобус заклікаў беларусаў «больш не ўспрымаць расійскую культуру як эталон», і заявіў, што выклаў у кнізе сутнасць сваіх стасункаў з ёй. Другое «я» Глобуса-Адамчыка, выказанае ў яркіх лапідарных нацюрмортах і кампазіцыях, з водгукамі кубістычных традыцый Лежэ і Пікаса, выглядае больш традыцыйным. Праўда, з'яўленне на парозе галерэі падчас адкрыцця міліцэйскай групы, якая шукала невядомага маньяка, справакавала ўспамін пра нядаўна зняtыя з экспазіцыі ў Купалаўскім музеі творы Цэслера і Вашкевіча, а таксама канстатацыю таго, што ў Беларусі кожная імпрэза сёння можа зрабіцца аб'ектам неадэкватнай увагі толькі таму, што ў ёй бярэ ўдзел неардынарная творчая асоба.

Што тычыцца адчыненай 14 красавіка ў Музеі сучаснага мастацтва (Незалежнасці, 47) выставы Кацярыны Сумаравай «Суб'ектыўны краявід», то яна — найперш свята каларыстычнага жывапісу. Краявід не столькі рэалістычны, колькі напоўнены адчуваннем стану прасторы, эмоцыі мастака, выказаных праз эксперыментальнае пераўтварэнне ўражанняў ад натуры. Адштурхнуўшыся ад убачанага, маладая мастачка стварае свет уласных перажыванняў, што дае падставу крытыкам казаць пра «тэатральнасць», увасобленую ў яе падыходзе да жывапісу…

Яшчэ дзве невялікія выставы выглядаюць своеасаблівым працягам ранейшых праектаў. Следам за Музеем сучаснага мастацтва Дом-музей I з'езду РСДРП звяртаецца да лялечнай тэматыкі. Але прадстаўляе тэматычна і канцэптуальна акрэсленую калекцыю «Чароўныя лялькі» славянскіх абрадавых прадметаў, пераважна тэкстыльных лялек, звязаных як з язычніцкім, так і хрысціянскім светаўяўленнямі (працуе па 4 мая). А ў Музеі гісторыі беларускага кіно (Свярдлова, 9) па 23 красавіка — жывапіс Віктара Ціханава і інсталяцыі Сяргея Шылы «*Круговорот продовольствия*», задуманыя як наследаванне іранічна-постмадэрнісцкага фэсту АРТ-БУЛЬБА ў Галерэі універсітэта культуры, у якім аўтары бралі ўдзел у 2008 годзе.




Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 12 верасня 2008.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 17.04.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.